ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарновым дадаткам „Прафрух")

| | | |
|---|---|---|
| На 1 мес. | — | 90 к. |
| „ 3 мес. | 2 р. | 60 к. |
| „ 6 мес. | 5 р. | — |
| „ 12 мес. | 9 р. | 75 к. |

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -вдатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЗЬЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:

| | |
|---|---|
| Рэдактар | 10-74 |
| Сакратар | 6-19 |
| Партсэктар | 13-80 |
| Сэктар інфармацыі | 13-80 |
| Начны рэдактар | 6-42 |
| Галоўная кантора | 7-81 |
| Аддзел падпіскі | 7-81 |
| » абвестак | 7-81 |

СЕРАДА, 27 жніўня 1930 г.

№ 200 (3798)

Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

# УРОКІ АРШАНШЧЫНЫ

Падрукаваная сёньня пастанова бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК дае адказ на тое, чаму пакончыў самагубствам рабочы-вылучэнец тав. **Юшкевіч.** Разьбіраючай прычынай самагубства тав. Юшкевіча зьяўляецца «бяздушна-чынноўніцкія адносіны да яго, як вылучэнца, і адсутнасьць сапраўднай сыстэматычнай дапамогі яму ў рабоце». У гэтай рэзалюцыі дадзена палітычная ацэнка як самага факту самагубства тав. Юшкевіча, так і агульнага становішча вылучэньства, кантролю рабочых над дзяржаўным і каапэрацыйным апаратам у Аршанскай акрузе. Пастанова бюро ЦК і ЦКК кляйміць, як праваапартуністычнае скажэньне лініі партыі, практыку кіруючых органаў Аршанскай акругі ў справе выкананьня важнейшых дырэктыў партыі па арабачэньні нашага дзяржаўнага і каапэрацыйнага апарату.

Спэцыяльны пункт рэзалюцыі абавязвае ўсе партыйныя, прафэсыянальныя і савецкія арганізацыі мабілізаваць масы і разам з імі праверыць выкананьне дырэктыў партыі па пытаньні аб арабочваньні дзяржаўнага і каапэрацыйнага апарату, як арганізаваны кантроль рабочых над дзяржаўным і каапэрацыйным апаратам і ці выконваюцца дырэктывы партыі аб вылучэньстве.

Гэта пастанова ЦК вынікае з агульна - партыйнай ацэнкі бягучага моманту, як пэрыяду абвостранай клясавай барацьбы. Наступленьне на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі знаходзіць сваё выяўленьне ва ўзмоцненай барацьбе нашай партыі супроць усіх бюракратычных і клясава - варожых элемэнтаў, што акапаліся ў нашых апаратах. Узмацненьне супраціўленьня капіталістычных элемэнтаў знаходзіць сваё выяўленьне ва ўзмацненьні супраціўленьня клясава - варожых і бюракратычных элемэнтаў нашых апаратаў мерапрыемствам партыі па арабочваньні гэтых апаратаў. Клясавы вораг, бюракрат вядзе зараз шалёную барацьбу супроць арабочваньня нашых апаратаў, супроць сыстэматычнага пралетарскага кантролю над нашым апаратам.

Важнейшай палітычнай памылкай Аршанскага кіраўніцтва зьяўляецца тое, што яна ня здолела выявіць клясава - варожы характар выступленьняў супроць вылучэнцаў. Дэклярацый аб барацьбе з клясавым ворагам у Аршанскай акрузе было надта многа, барацьбы было мала. Аршанскае кіраўніцтва не даацаніла палітычнага характару барацьбы супроць вылучэнцаў.

У справе Юшкевіча, як і ў некаторых іншых справах вылучэнцаў, Аршанскае кіраўніцтва не даацаніла палітычнага значэньня ўсяе праблемы аб кадрах. Дрэннае кіраўніцтва вылучэньствам, невыстарчальная дапамога вылучэнцам у іх рабоце, зьяўляецца паказчыкам слабой барацьбы за пралетарскія кадры. За пралетарскія кадры ў Аршанскай акрузе змагаліся невыстарчальна, паколькі цэлы рад вылучэнцаў адніхаўся ад сапраўды кіруючай работы ў дзяржаўных і каапэрацыйных арганізацыях. «Аршаншчына» вучыць, што праблема пралетарскіх кадраў можа быць вырашана толькі ва ўмарным змаганьні з тымі бюракратычнымі і клясава-варожымі элемэнтамі, якія яшчэ сядзяць у нашых апаратах і скарыстоўваюць гэты апарат для таго, каб сарваць справу выхаваньня новых пралетарскіх кадраў. Адным з вынікаў справы Юшкевіча зьяўляецца тое, што сапраўдная барацьба за пралетарскія кадры патрабуе ад партыйнай арганізацыі ўмартага і сыстэматычнага змаганьня з усімі тымі, хто не дае магчымасьці вылучэнцам працаваць.

Усе рабочыя - вылучэнцы сурова асуджаюць самагубства, як мэтад барацьбы з бюракратычнымі скажэньнямі нашага апарату

Дырэктывы партыі аб тым, каб вылучэньне праводзіць як сапраўды масавую работу, пад кантролем мас, груба парушаліся. Масы ў Аршаншчыне ня прымалі актыўнага ўдзелу ў вылучэньні, ня прымалі ўдзелу ў кантролі над умовамі работы вылучэнцаў. Ня было мабілізацыі мас і на барацьбу з тымі, хто цкаваў, змагаўся з вылучэнцамі. Ня было і справаздач перад масамі саміх вылучэнцаў аб сваёй рабоце. Адрыў ад мас работы па вылучэньні зьяўляецца другой важнейшай палітычнай памылкай аршанскіх кіруючых арганізацый.

Аршанскія партыйныя, савецкія і прафэсыянальныя арганізацыі вынесьлі шмат пастаноў аб рабоце вылучэнцаў, аб рабоце з вылучэнцамі. Але амаль усе гэтыя пастановы аказаліся пустымі дэклярацыямі. Пастанова аб прыцягненьні мас ёсьць, але яна ня выканана. Ёсьць таксама пастановы аб дапамозе вылучэнцам, але і гэтыя пастановы таксама нявыкананы. **Пустая дэклярацыйнасьць, адсутнасьць праверкі выкананьня, адсутнасьць кантролю над тым, як выконваюцца галоўнейшыя партыйныя пастановы, — вось наступная буйнейшая палітычная памылка Аршанскага кіраўніцтва.** Мала выносіць прыгожыя пастановы, мала прымаць стопроцантныя рэзалюцыі, — галоўнае заключаецца ў тым, каб на практыцы рэалізаваць, праводзіць у жыцьцё гэтыя пастановы. У Воршы гэтага ня было.

Кідаецца ў вочы адарванасьць аршанскіх кіруючых арганізацый і саміх кіраўнікоў ад вылучэнцаў. Камуністыя - кіраўнікі ўстаноў ня цікавіліся вылучэнцамі, або, у лепшым выпадку, цікавіліся пытаньнем «ці няма скаргаў». У многіх выпадках камуністыя - кіраўнікі пляліся ў хвасьце бюракратычных і клясава - варожых элемэнтаў апарату, у радзе выпадкаў кіраўнікі ўстаноў, замест таго, каб абаперціся на вылучэнцаў і з іх дапамогай весьці барацьбу за перабудову апарату, за яго далейшае арабочваньне, — ігнаравалі вылучэнцаў.

Адным з урокаў Аршаншчыны павінна быць абавязковае забесьпячэньне цеснай сувязі ўсіх кіруючых арганізацый і ўсіх кіраўнікоў з вылучэнцамі. Усякім элемэнтам ігнараваньня вылучэнцаў, усякай спробе адносіцца да вылучэнца як да «штатнай адзінкі», трэба даць жорсткі адпор.

Гандлёва - каапэрацыйная ячэйка ў Воршы ня здолела забясьпечыць выкананьне важнейшых дырэктыў партыі. Замест таго, каб дапамагчы вылучэнцу, яна, у асобе свайго кіраўніцтва, фактычна дапамагала цкаваць Юшкевіча. Замест таго, каб прыцягнуць да адказнасьці тых, хто шкодзіў Юшкевічу, яна па сутнасьці стаяла на баку тых, хто змагаўся з Юшкевічам. Націск на ячэйку бюракратычных і клясава - варожых элемэнтаў быў такі моцны, што рабочы вылучэнец ня змог абаперціся на ячэйку ў сваім змаганьні супроць бюракратаў і чыноўнікаў.

XVI зьезд партыі па дакладу ЦКК вынес пастанову аб тым, што «партыйныя ячэйкі і члены партыі, як паказаў вопыт чысткі і факты шкодніцтва, часта не стаялі на чале барацьбы са скажэньнямі клясавай лініі, пляліся ў хвасьце і не сыгналізавалі партыі аб гэтых зьявішчах». Аршанская гандлёва - каапэрацыйная ячэйка і належыць да ліку тых ячэек, якія не стаялі на чале барацьбы са скажэньнем клясавай лініі ў пытаньнях аб арабочваньні дзяржаўных і каапэрацыйных апаратаў.

Адным з важнейшых урокаў самагубства Юшкевіча павінен быць рашучы пералом у рабоце ўсіх савецкіх ячэек. Задачы ў галіне арабочваньня апаратаў, стварэньня спрыяючых умоў для вылучэнцаў, арганізацыя рабочага кантролю над работай дзяржаўных і каапэрацыйных апаратаў, павінны стаць важнейшымі карэннымі задачамі ўсіх савецкіх ячэек.

Самагубства Юшкевіча — гэта сыгнал усім нашым арганізацыям аб неабходнасьці сыстэматычнага кантролю над умовамі работы вылучэнцаў. Выпадак у Воршы зьяўляецца вынікам грубога ігнараваньня пастаноў партыі аб арганізацыі кантролю (шэфства) рабочых над дзяржаўным і каапэрацыйным апаратам. XVI зьезд партыі па гэтым пытаньні даў жорсткую дырэктыву: «партыйныя арганізацыі, асабліва заводзкія, павінны разглядаць шэфства як важнейшую частку сваёй масавай працы»..., «шэфства, як масавы пралетарскі рух, накіраванае на паляпшэньне працы савецкага апарату, павінна знайсьці **выключнае** падтрыманьне і дапамогу з боку ўсіх арганізацый». Перад намі стаіць задача — гэтыя дырэктывы XVI зьезду партыі аб шэфстве панесьці ў масы. **Масавую праверку,** якую прапануе правесьці Цэнтральны Камітэт і Цэнтральная Кантрольная Камісія КП(б)Б, трэба цалкам скарыстаць для таго, каб рэалізаваць гэтыя дырэктывы XVI зьезду партыі.

Бюро Цэнтральнага Камітэту партыі і прэзыдыум ЦКК кваліфікавалі работу аршанскіх арганізацый у галіне арабочваньня дзяржаўных і каапэрацыйных апаратаў і вылучэньня, як праваапартуністычнае скажэньне лініі партыі. Інакш нельга ацаніць невыстарчальную барацьбу з тымі, хто срываў работу вылучэнцаў, інакш нельга ацаніць прымірэнцкія адносіны да тых, хто зьдзекваўся над Юшкевічам, хто ня здолеў узьняць на палітычную вышыню барацьбу супроць бюракратычных і клясава - варожых элемэнтаў у дзяржаўным і каапэрацыйным апараце.

Гэтыя скажэньні лініі партыі ў справе вылучэньства зьяўляюцца вынікам адсутнасьці разгорнутай бальшавіцкай **самакрытыкі.** Усюды гаварылі аб ганеньнях на вылучэнцаў пагул і па Юшкевіча ў прыватнасьці, а кіраўніцтва акругкому, акрвыканкому, АКК і акрпрафбюро пра гэта «ня ведалі».

Шырэй разгарнуць бальшавіцкую самакрытыку, — вось што вынікае з аршанскіх спраў. Толькі ва ўмовах разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі можна весьці бязьлітаснае змаганьне са скажэньнямі дырэктыў партыі, толькі ва ўмовах разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі можна забясьпечыць сапраўдны ўдзел мас у барацьбе за генэральную лінію партыі.

Усе партыйныя арганізацыі, усе прафэсыянальныя і савецкія арганізацыі павінны зараз-жа ўзяцца **за праверку выкананьня дырэктыў партыі аб вылучэнстве, аб рабочым шэфстве над апаратам і арабочваньні дзяржаўнага і каапэрацыйнага апарату.** Уся гэта праверка павінна праходзіць пры актыўным удзеле мас і пры ўзмоцненай барацьбе з правымі і «левымі» апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі і прымірэнцкімі адносінамі да гэтых скажэньняў.

## Апошнія карты на стол

### ПІЛСУДЗКІ «ПРЫНЯЎ КАМАНДУ» НАД УРАДАМ

**ВАРШАВА, 26.** Прэзыдэнт рэспублікі падпісаў дэкрэт аб назначэньні маршалка Пілсудзкага старшынёю савету міністраў і ваенным міністрам, палкоўніка **Язэпа Бэка** — міністрам без партфэля, **Складкоўскага**—унутраных спраў, **Залескага**—замежных спраў, **Цара**—юстыцыі, **Чэрвінскага**—народнай асьветы, **Квяткоўскага**—гандлю і прамысловасьці, **Матаковіча**—грамадзкіх работ, **Прыстара** — працы, **Бэрнера**—пошты і тэлеграфу і **Матушэўскага**—кіраўніком міністэрства фінансаў.

***

**Хаця, як відаць са зьмешчанай вышэй тэлеграмы, фактычна склад польскага ўраду застаўся бяз зьмен, аднак унутраныя перагрупоўкі ў фашысцкім лягеры і ўрадзе, назначэньне Пілсудзкага прэм'ерам — усё гэта зьяўляецца важнай палітычнай падзеяй, якая павінна прыцягнуць увагу працоўных Савецкага Саюзу і ўсяго сьвету.**

**Прычынай урадавай зьмены ў Польшчы зьяўляецца надзвычай востры гаспадарчы і палітычны крызіс польскага фашызму, ускладненьні ў міжнародным становішчы Польшчы, узмоцненая падрыхтоўка польскага фашызму да вайны з Савецкім Саюзам, — з аднаго боку, а з другога — рост рэвалюцыйнага руху ў Польшчы.**

**За апошні час Пілсудзкі, які фактычна ўвесь час пасьля майскага перавароту 1926 году кіраваў палітыкай Польшчы, — стараўся для віду трымацца «ў цяні». Зараз, калі відавочна поўнае банкруцтва фашысцкае дыктатуры, Пілсудзкі «прымае каманду» над урадам. Польскі фашызм, ставячы афіцыйна Пілсудзкага на чале ўраду, —кладзе на стол апошнія карты.**

**Урад Пілсудзкага павядзе зьверскае наступленьне на рабочую клясу Польшчы, спрабуе надзвычайным тэрорам, разьбіць рэвалюцыйны рух, «уціхамірыць» крэсы — Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну.**

**Урад Пілсудзкага азначае прысьпяшэньне падрыхтоўкі да вайны з Савецкім Саюзам. Не дарма Пілсудзкі прыходзіць да ўлады пасьля інтэнсіўных наведваньняў дэлегацый розных генштабаў, пасьля візытаў прэзыдэнта Масьціцкага ў Эстоніі, пасьля шматлікіх «экскурсый» польскага генштабу ў Румынію, Эстонію і г. д., напярэдадні адчыненьня антысавецкай «аграрнай» канфэрэнцыі ў Варшаве. Пілсудзкі, кіраўнік «паходу на Кіеў», невыпадкова прыходзіць да ўлады ў час надзвычайнай шуміхі ў Польшчы навакол беларуска-савецкай вайны.**

**Прыход да ўлады Пілсудзкага азначае ўзмацненьне пагрозы вайны з Савецкім Саюзам.**

**Працоўныя Савецкага Саюзу павінны ўважліва сачыць за падзеямі, што адбываюцца ў Польшчы.**

## Да турэцка-пэрсыдзкага канфлікту

На здымку: Салдаты пэрсыдзкай пагранічнай варты

## Плян сіласаваньня выкананы на 1,1%

# Далейшая павольнасьць—ЗЛАЧЫНСТВА!

# Кожны лішні страчаны дзень—удар па сіласаваньні

## У БОЙ

Нядаўна, у карэспандэнцыі **«Прыгавар лічбаў»** мы сыгналізавалі аб ганебных прарывах на сіласным фронце. Плян сіласнага будаўніцтва і сіласаваньня кармоў,—пісалі мы,—ня выкананы ні на адзін процант.

Ці зьмянілася становішча за другую дэкаду. Ці дабіліся мы патрэбнага пералому ў сіласаваньні? **Не.** Сёньня яшчэ раз прыходзіцца біць трывогу. Сіласаваньне ў БССР амаль не разгорнута. Прачытайце апошнюю зводку НКЗ БССР аб сіласаваньні і вы глыбока пераканаецеся, што барацьба за сілас вядзецца слаба, злачынна слаба.

Саўгасы БССР за другую дэкаду жніўня плян сіласаваньня выканалі толькі на 0,6 проц. Некалькі ўперадзе ідуць калгасы: яны выканалі плян на 2,2 проц. Але хіба гэта зьяўляецца выстарчальным. Хіба нас можа задаволіць такі мізэрны процант выкананьня калгасамі пляну сіласаваньня, як 2,2. Зразумела, не.

Калі, нарэшце, скончыцца гэта тантаньне на адным месцы? Калі НКЗ БССР, Белкалгасцэнтр, Белсельтрэст, камсамол, раёны даб'юцца карэннага пералому ў сіласаваньні? Час не чакае. Кожны лішні страчаны дзень—удар па сіласаваньні, па жывёлагадоўлі. Далей нельга марудзіць. **Усякая далейшая паовльнасьць—злачынства. У рашучы бой за сілас!**

## ГАНЬБА!

ЗВОДКА НКЗ БССР АБ СТАНОВІШЧЫ СІЛАСАВАНЬНЯ НА БЕЛАРУСІ НА 10 ЖНІЎНЯ ПАКАЗВАЛА АБСАЛЮТНЫ НУЛЬ. ЗВОДКА НА 20 ЖНІЎНЯ ЛЕДЗЬ-ЛЕДЗЬ УЗЫНМАЕЦЦА НАД УЗРОЎНЕМ НУЛЯ. ВОСЬ ГЭТЫЯ ГАНЕБНЫЯ ЛІЧБЫ:

САЎГАСЫ ЗАСІЛАСАВАЛІ НА 20 ЖНІЎНЯ 791 ТОНУ, ШТО СКЛАДАЕ 0,6 ПРОЦ. ПЛЯНУ; КАЛГАСЫ — 10.000 ТОН, АБО 2,2 ПРОЦ. ПЛЯНУ; ІНДЫВІДУАЛЬНЫ СЭКТАР—500 ТОН (0,11 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ).

УСЯГО З ПЛЯНУ Ў 1 МЛН. ТОН ЗАСІЛАСАВАНА 11.290 ТОН,—1,1 ПРОЦ.

МЫ СТАВІМ ПЫТАНЬНЕ НАРКАМЗЕМУ БЕЛАРУСІ, БЕЛКАЛГАСЦЭНТРУ, БЕЛСЕЛЬТРЭСТУ: ШТО БУДЗЕ ДАЛЕЙ?

## Вежа, якая зьнікла

**27-га ліпеня БЫХАЎСКІ райкалгасаюз атрымаў паведамленьне, што на яго адрас з БАБРУЙСКУ адгружана стандартная сіласная вежа. На мясцовай чыгуначнай станцыі, куды пайшлі прадстаўнікі Райкалгасаюзу 2 жніўня, сказалі, што вежы яшчэ няма. З 5, 7, жніўня прадстаўнікі райкалгасаюзу атрымалі на станцыі такі-ж самы адказ. Вежа невядома дзе зьнікла.**

**Нарэшце пасьля доўгіх і настойлівых пошукаў было выяўлена, што сіласная вежа прыбыла на станцыю Быхаў яшчэ 30 ліпеня. але... адміністрацыя станцыі пра гэта ня ведала. У накладной на сіласную вежу паказвалася: «СКЛАДАНЫЯ БАРАКІ Ў РАЗАБРАНЫМ ВЫГЛЯДЗЕ». З гэтае прычыны чыгуначная адміністрацыя ня ведала, што сіласная вежа знаходзіцца на станцыі.**

**Камісія, якая прымала сіласную вежу, выявіла цэлы рад залічных непарадкаў, дапушчаных чыгуначнай адміністрацыяй. Вежа была выгружана абыяк.. Станцыя ня ўжыла ніякіх захадаў, каб захаваць вежу ў спраўнасьці. Значная частка клёпак, з якіх складаецца вежа (дарэчы каштуе 5.200 руб) ПАПСАВАНА. Злучальныя зубы часткова абламаны. Вінаватых у гэтым гапавацтве трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці.**

К.

## 0,5 проц. пляну

МАГІЛЕЎ, 26. (Наш кар.). **Магілеўшчына** па-ранейшаму **ня выконвае** пляну сіласнага будаўніцтва і сіласаваньня кармоў. Некаторы зрух, які ёсьць у сіласаваньні, пакуль ні ў якім разе **не забясьпечвае** выкананьня пляну.

На сёньня па ўсіх раёнах выкапана толькі 189 сіласных ям на 11.184 куб. мэтраў **(3.5 проц.** заданьня). Процант выкананьня пляну сіласаваньня яшчэ больш **ганебны.** Да гэтага часу засілавана толькі 5.686 тон сіласнай масы, што складае **0,5 проц.** пляну. У чым заключаюцца прычыны такіх злачынна-марудных тэмпаў сіласаваньня на Магілеўшчыне?

Як правіла, пляны сіласаваньня **не даведзены** да калгасаў і сельсаветаў. Сіласаваньне **не папулярызавана** сярод калгасьнікаў і адзіначасобнікаў. Раённыя, партыйныя і камсамольскія арганізацыі, а таксама і зямельна-калгасныя органы амаль **не цікавяцца** гэтай важнейшай справай.

Шмат якія аграномы ня выехалі ў калгасы і саўгасы для практычнага кіраўніцтва сіласаваньнем. У прыватнасьці ў Касьцюковіцкім раёне аграномы пальцам не паварушылі, каб штонебудзь зрабіць па сіласаваньні.

Адзначаем раёны, якія правальваюць пляны сіласаваньня. У **Чачэвіцкім** раёне да сёнешняга дня у сельсаветы нават не пасланы пляны сіласаваньня. У раёне выкапаны ўсяго тры ямы. Ні адна тона кармоў не засілавана. У **Магілеўскім** раёне выкапана ўсяго 28 ям на 500 куб. мэтраў. Да сіласаваньня прыступіў толькі адзін калгас. У **Хоцімскім** раёне плян сіласаваньня правалены: выкананa ўсяго 7 ям. РВК, камсамольская арганізацыя, раённыя зямельна-калгасныя органы па сіласаваньні нічога ня робяць.

Некаторага пералому ў сіласным будаўніцтве дабіўся **Бялыніцкі** раён: ён на сёньня выканаў **25 проц.** пляну.

## Бульбяны грыбок пагражае

### ВЫРАТУЕМ ТЫСЯЧЫ ТОН БУЛЬБЫ

### АТРЫМАЕМ СОТНІ ТЫСЯЧ ТОН СІЛАСНАЙ МАСЫ

Бульбяны грыбок зьяўляецца небясьпечным ворагам бульбы. **Мільён тон бульбы кожны год гіне на Беларусі ад бульбянога грыбка.** У некаторых раёнах БССР распаўсюджаньне бульбянога грыбку носіць эпідэмічны характар. Патрэбны самыя рашучыя меры. Трэба выратаваць сотні тысяч тон бульбы. Як гэта зрабіць?

Мы раім **скошваць бульбянік,** заражоны бульбяным грыбком. Гэта мерапрыемства **папярэджвае** заражэньне клубняў бульбы бульбяным грыбком. Скошваць бульбянік трэба за два тыдні да ўборкі бульбы. Гэта важнейшае мерапрыемства павінна быць абавязкова праведзена, тым больш, што скошаны бульбянік можна **скарыстаць на сілас.** У БССР ад скошанага бульбяніку можна атрымаць **49 млн. падвойных цэнтнэраў сіласных кармоў.**

Такім чынам, вядучы барацьбу з бульбяным грыбком, мы выратуем тысячы тон бульбы і атрымаем сотні тысяч тон зялёнай масы для сіласаваньня. Кожны калгас і саўгас у гэтым годзе павінен абавязкова скасіць бульбянік. Сярод адзіначасобных бядняцка - серадняцкіх гаспадарак таксама трэба павесьці самую шырокую растлумачальную работу. Мы павінны памятаць, што ў гэтым годзе ў сувязі з дажджамі эпідэмічнае распаўсюджаньне бульбянога грыбка будзе асабліва вялікім. На фронт барацьбы з грыбком павінны быць кінуты ўсе нашы сілы.

**М. ДАРОЖКІН.**

Косяць бульбоўнік для сіласу

## ЗОТНІ ТОН СІЛАСНАГА СЫРЦУ Ў НЕБЯСЬПЕЦЫ

Зараз у агародным калгасе на **Татарскай вул. (Менск)** ідзе поліва. Старшыня калгасу **Джынаевіч** загадаў у часе поліва **выкідваць вон** усе сарнякі. У выніку, марна гіне шмат такіх каштоўных для сіласаваньня траў, як асот, дзядоўнік, лебяда і інш. За два дні поліва выкінута вон шмат усіх гэтых траў, якія далі-б ня менш 167 тон сіласнай масы.

Цяпер на агародах пачалі выбіраць буракі і моркву. Сьцябло морквы і бурака зьяўляецца добрым сырцом для сіласаваньня. Аднак, гародзнікі заяўляюць, што сьцябло няма куды дзець. Ёсьць небясьпека, што 17 тон добрай сіласнай масы **загінуць.** Праўленьне калгасу **нічога** ня робіць, каб скарыстаць гэтае сьцябло для сіласаваньня. Трэба прымусіць праўленцаў падумаць аб гэтым. Нельга дапусьціць каб марна загінулі дзесяткі тысяч пудоў добрага сырцу для сіласаваньня.

А.

## Аб правядзеньні гарадзкіх і раённых партканфэрэнцый

### Пастанова бюро ЦК ад 23 жніўня 1930 г.

Згодна пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16-га жніўня аб правядзеньні партыйных канфэрэнцый ва ўсіх раённых і гарадзкіх арганізацыях, Бюро ЦК пастанаўляе:

1. Гарадзкія партканфэрэнцыі ў Гомелі і Менску для выбараў гаркомаў і гарадзкіх КК і раённыя партканфэрэнцыі правесьці паміж 1 жніўня і 20 верасьня. Арг.-інструктарскаму аддзелу ўзгадніць з райкомамі дакладныя тэрміны райпартканфэрэнцый.

2. Модус прадстаўніцтва на райпартканфэрэнцыі ўстанавіць наступны: раёны, якія налічваюць да 100 сапраўдных членаў, абіраюць 1 дэлегата ад кожных 2 сапраўдных членаў; тыя, што налічваюць ад 100 да 300, абіраюць 1 дэлегата ад 3 сапраўдных членаў партыі, ад 300 да 500—1 дэлегата на 5 сапраўдных членаў; ад 500 да 1000—1 дэлегата на 10 сапраўдных членаў; арганізацыі-ж, якія налічваюць звыш 1000 членаў—1 дэлагата на кожныя 15 сапраўдных членаў.

3. Акругкомам і арг.-інструктарскаму аддзелу ЦК забясьпечыць удзел прадстаўнікоў ЦК і ЦКК або АК і АКК на ўсіх раённых партканфэрэнцыях.

4. Прапанаваць райкомам забясьпечыць працягласьць партканфэрэнцый ня больш аднаго дня.

5. Рэкамандаваць партканфэрэнцыям уключыць у парадак дня, апрача выбараў кіруючых органаў: у **сельскіх** раёнах — аб чарговых задачах збожжазагатоўчай і асеньняй пасеўнай кампаніі, а ў **прамысловых** раёнах—аб выніках выкананьня прамфінпляну, барацьбе з прагуламі і пэрспэктывах на 1930-31 гаспадарчы год

6. На гарадзкіх і раённых партканфэрэнцыях у Гомелі, Менску і Жлобі не паставіць даклады аб гатоўнасьці чыгуначных вузлоў да асеньніх перавозак

7. Пры вызначэньні колькаснага складу райкомаў выходзіць з колькаснага складу партарганізацый прыкладна ад 9 да 17—19 членаў. Далейшае павялічэньне складу лічыць магчымым толькі для арганізацый якія налічваюць больш 1000 камуністых (прыкладна да 25—29 членаў)

8. Абавязаць райкомы, пасьля перавыбараў, але не пазьней 1-га кастрычніка, прысылаць у арг.-інструктарскі аддзел справаздачу аб райпартканфэрэнцыях, пратаколы і складабраных Райкомаў і Раённых КК.

## Абсьледваньне работы КП(б)Б

**У сувязі з тым, што ў кастрычніку месяцы ў ЦК УсеКП(б) будзе заслухан даклад ЦК КП(б)Б, у Менск прыбылі адказныя інструктары ЦК УсеКП(б) т. т. ГІЛІНСКІ і ЖАБРОЎ для абсьледваньня ўсёй работы камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі.**

**Сумесна з тав. Гілінскім і Жабровым у абсьледваньні будуць прымаць удзел прадстаўнікі раду Саюзных устаноў і арганізацый.**

**Абсьледваньне закране ўсе галіны сацыялістычнага будаўніцтва БССР. Для ўдзелу ў рабоце па абсьледваньні будуць прыцягнуты шырокі партыйныя і беспартыйныя працоўныя масы.**

**Падрабязна аб задачах абсьледваньня—у наступным нумары «Зьвязды».**

# Пастанова бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б па справе аб самагубстве вылучэнца ЮШКЕВІЧА

1. Канстатаваць, што важнейшыя дырэктывы партыі аб арабачэньні дзяржапарату, арганізацыі кіраўніцтва шэфствам рабочых над дзяржаўнымі і каапэрацыйнымі апаратамі і забесьпячэньне вылучэнцам спрыяючых умоў для працы акругкомам партыі, АКК, акрвыканкомам і акрпрафбюро ня выконваліся зусім, або выконваліся бюракратычна, па-казённаму (вылучэньне рабілася бяз удзелу мас, вылучэнцы дрэнна падбіраліся для пэўнай работы, ня было справаздачнасьці вылучэнцаў перад рабочымі масамі, а таксама ня было пралетарскага кантролю над умовамі працы вылучэнцаў).

2. Партарганізацыя, рабочыя масы былі слаба мабілізаваны на барацьбу з бюракратычнымі і клясава-варожымі элемэнтамі ў дзяржаўных і каапэрацыйных апаратах—гэтыя элемэнты ня сустракалі адпаведнага адпору ў сваёй барацьбе супроць вылучэнцаў. Адносіны да вылучэнцаў у большасьці выпадкаў былі фармальна-бюракратычнымі, ім не аказвалася патрэбная дапамога ў рабоце.

3. АК, АКК, акрвыканком і акрпрафбюро былі адарваны ад вылучэнцаў, не правяралі выкананьня дырэктыў партыі аб вылучэнстве і арабачэньні дзяржаўнага і каапэрацыйнага апаратаў.

Усе гэтыя недахопы зьяўляюцца вынікам праваапартуністычнага скажэньня лініі партыі і адсутнасьці разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі ў Аршанскай арганізацыі.

4. Асноўнай і важнейшай прычынай самагубства тав. Юшкевіча зьяўляюцца бяздушна-чыноўніцкія адносіны да тав. Юшкевіча, як вылучэнца, і адсутнасьць сапраўднай сыстэматычнай дапамогі яму ў рабоце, якая тым больш была неабходна, што тав. Юшкевічу было цяжка спраўляцца з даручанай яму работай (аб чым ведалі і ніхто мер ня прымаў). Адносіны да тав. Юшкевіча з боку кіраўніка і тэхнічнага апарату акргандлю былі яўнымі зьдзекамі (Дабравольскі, асабліва Гейман).

5. Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК пастанаўляюць:

а) Абвясьціць суровую вымову бюро Аршанскага акругкому, прэзыдыуму АКК, фракцыі прэзыдыуму акрвыканкому і акрпрафбюро.

б) Абвясьціць суровую вымову бюро гандлёва-каапэрацыйнай ячэйкі і распусьціць бюро за праваапартуністычную практыку ў адносінах да вылучэнцаў. Сакратара ячэйкі тав. МАЦАВА зьняць з адказнай работы на 2 гады.

в) Выключыць з партыі Геймана (сакратар акргандлю) за зьдзекі над Юшкевічам, забараніўшы яму на 3 гады работу ў савецка-каапэрацыйных арганізацыях.

г) Абвясьціць суровую вымову і паслаць на нізавую работу т. т. ВІЛЕНСТОВІЧА, ЛАЎРЫНОВІЧА, ХАНДОГУ, СЬВІРЫДАВА, КОХАНА і ВЕЛЕСКА.

д) У сувязі з тым, што тав. Дабравольскі адсутнічаў (знаходзіцца на вучобе ў Ленінградзе), прасіць ЦКК выклікаць яго і асобна абмеркаваць аб ім пытаньне.

е) Паставіць на від бюро парткалектыву «Чырвоны Кастрычнік» за слабую сувязь з вылучэнцамі і невыстарчальны кантроль над умовамі работы вылучэнцаў.

6. Даручыць пракуратуры павесьці ў судовым парадку расьсьледваньне з мэтай прыцягненьня вінаватых у самагубстве тав. Юшкевіча да судовай адказнасьці.

7. Прапанаваць райкому партыі разгарнуць шырокую растлумачальную работу аб прычынах самагубства т. Юшкевіча, забясьпечыўшы сапраўдную бальшавіцкую самакрытыку ўсіх недахопаў у Аршанскай арганізацыі і бязьлітасную барацьбу з правым апартунізмам на практыцы.

8. Райкому партыі арганізаваць з удзелам рабочых, калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас праверку скарыстаньня ўмоў работы і адносін да вылучэнцаў ва ўсіх арганізацыях і ўстановах, прыцягваючы да суровай адказнасьці ўсіх, хто парушае дырэктывы партыі па гэтым пытаньні.

9. Аршанскаму Райкому партыі арганізаваць сыстэматычную работу па забесьпячэньні вылучэнцам спрыяючых умоў для працы і сыстэматычнай сувязі з імі рабочых мас.

10. Разглядаючы самагубства т. Юшкевіча, як трывожны сыгнал аб узмацненьні супраціўленьня бюракратычных і клясава-варожых элемэнтаў у дзяржаўным і каапэрацыйным апараце палітыцы партыі на арабачэньне дзяржаўнага і каапэрацыйнага апарату, і канстатуючы наяўнасьць раду буйнейшых недахопаў у справе выкананьня дырэктыў партыі аб вылучэнцах, Бюро ЦК ПРАПАНУЕ: усім акругкомам, гаркомам і райкомам партыі, усім рабочым і савецкім ячэйкам, фракцыям прафэсыянальных, савецкіх, дзяржаўных і каапэрацыйных устаноў арганізаваць з удзелам шырокіх рабочых мас праверку выкананьня дырэктыў партыі аб арабачэньні дзяржаўнага і каапэрацыйнага апаратаў і аб вылучэнцах. Газэце «Зьвязда» арганізаваць агляд выкананьня дырэктыў партыі аб вылучэнстве, мабілізаваўшы для гэтага адпаведную колькасьць рабочых брыгад як у Менску, так і ў гарадох і раёнах.



# ТРЫВОЖНА ГУДУЦЬ ПАРАВОЗЫ...

## Апартуністыя закрылі сэмафоры перад хлебным патокам

### Перавозкі захапілі Віцебскі вузел зьнянацку

### ЗМОВА МАЎЧАНЬНЯ І СЫГНАЛЫ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ

### Экзамэн для чыгуначных арганізацый

Пасьпяховая падрыхтоўка і правядзеньне асеньня-зімовых перавозак—экзамэн для чыгуначных партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый.

У мінулым годзе перавозкі захапілі Віцебск зусім непадрыхтаваным. Ня было своячасова скончана патрэбнае будаўніцтва, ня былі падрыхтаваны пакгаузы... У выніку—пробкі, вялікія прастоі вагонаў, несвоячасовая падача паравозаў і г. д. Прычынай такога становішча з перавозкамі зьявілася ганебная бязьдзейнасьць гаспадарнікаў, адсутнасьць парткіраўніцтва і актыўнага ўдзелу прафсаюзаў. Усё гэта павяло да выпадкаў простага злачынства, шкодніцтва і г. д.

### Сыгналы друку—пусты гук для... віцебскіх бюракратаў

Друк, і ў прыватнасьці «Зьвязда», некалькі раз ужо сыгналізавалі аб прарывах у падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак на Віцебскім вузьле. Але сыгналы і патрабаваньні друку засталіся пустым гукам.

Падамо некалькі найбольш характэрных фактаў.

Дагэтуль павінна быць скончана работа на набудове тупіка і пляцоўкі. Будаўніцтва толькі распачата, што пагражае вялікім скапленьнем неразгружаных вагонаў.

Вугальны склад таксама не пабудаваны. Гэта няўхільна выкліча вялікія прастоі паравозаў пры наборы вугалю—паравозы ня будуць своячасова падавацца да вагонаў. Да рэчы, вугальныя склады не мэханізаваны, не асьветлены.

Саюзхлебам пя выканана дырэктыва аб набудове да 15-га жніўня 8 пакгаузаў для хаваньня хлеба. Будуюцца толькі 2 пакгаузы. Прыпінейныя пакгаузы (№№ 3-6-7-8), якія заняты рознымі таварамі, да гэтага часу Саюзхлебам не апарожнены. Па лініі Чэпіна—Гарадок—Полацак і г. д. павінна было быць узведзена 20 пакгаузаў, набудова, якіх таксама да гэтага часу не распачата. Такіх фактаў можна прывесьці шмат.

### Рэальная пагроза

Яшчэ ўвесну ў Віцебску ведалі пра тое, што вузлу ўвосень будзе патрэбна ня менш як **1.300** кваліфікаваных рабочых і спэцыялістых. Нейкі час таму назад былі арганізаваны курсы, на якія ўскладалася задача падрыхтаваць неабходныя кадры да асеньня-зімовых перавозак. Зараз для нас зусім зразумела, што працуючыя курсы ні ў якай меры ня могуць задаволіць патрэб, Віцебскага вузла. На курсах падрыхтоўваецца 558 спэцыялістых па розных галінах работы. Такім чынам, не хапае зрыву 700 кваліфікаавных рабочых.

Курсамі ніхто ня кіруе і ня цікавіцца.

Мы ня можам не адзначыць, што ні адна чыгуначная віцебская арганізацыя дагэтуль ня мае ніякага ўяўленьня аб тым, як будзе на вузьле вырашана праблема кадраў. Перавозкі ўжо пачаліся. На днях партарганізацыі, прафсаюзы і гаспадарнікі сустрэнуцца з вялікім недахопам машыністых, сьлесароў, токараў, качагараў, кандуктароў, змазчыкаў, тэхканторшчыкаў і г. д. Чыгуначныя партарганізацыі і прафсаюзы ня выканалі важнейшае дырэктывы партыі аб падрыхтоўцы неабходных кадраў сваімі ўласнымі сіламі і гэтым самым стварылі небясьпеку зрыву асеньня-зімовых перавозак.

Зараз на будаўніцтве павінна было быць занята ня менш 4.000 рабочых. З кожным днём ліх занятых рабочых памяншаецца. За 15 дзён жніўня колькасьць рабочых на будаўніцтве паменшылася прыкладна на 2.000 чалавек. Рабочыя-сэзонныкі не забясьпечаны квэтэрамі і г. д. Сярод сэзоньнікаў ні прафсаюзы, ні партарганізацыі ніякай палітычна-асьветнай работы не праводзяць. Сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам—ахоплены толькі адзінкі. Адсутнасьцю палітычнае работы сярод сэзоньнікаў карыстаюцца кулацкія элементы. Ёсьць рад фактаў шкодніцтва, рвацтва і злачынных адносін да работы.

### П'яніцы—на паравозах

Цяперашняе выкапаньне асноўных паказальнікаў на вытворчасьці ні ў якім разе ня можа забясьпечыць пасьпяховага правядзеньня асеньня-зімовых перавозак. Вытворчая праграма за 9 месяцаў бягучага гаспадарчага году ня выканана. У 3-м квартале недавыкананьне заданьняў па рамонце паравозаў, складае больш чым 60 проц. Паравозы прастойваюць ў рамонце па некалькі дзён звыш устаноўленых тэрмінаў. Ні ў адным з кварталаў бягучага году ня выканана заданьне па міжрамонтнаму прабегу паравозаў (заданьне 71.500 кілёмэтраў, прабег—65.053 кілёмэтры). Гэта гаворыць аб нядобраякасных работах рамонтных работ. Вялізарныя прастоі паравозаў у адточцы. Перавыдатак чалавека-гадзін на рамонт адзінкі—у першым квартале—968 чалавека-гадзін, у другім—469.

Здарэньні на чыгунцы катастрафічна растуць. Вось кароткая зводка: сутычкі цягнікоў—у студзені—2 выпадкі, у лютым—3, у сакавіку—4, у красавіку—2, у маі—2, у чэрвені—4 і ў ліпені—5.

Сходы з рэек цягнікоў—у красавіку—6, у маі—9, у чэрвені—12, у ліпені—13 і ў першую пяцідзёнку жніўня—3. Псаваньне паравозаў, абрывы цягнікоў і г. д. з кожным днём набываюць усё большыя памеры.

Дзе прычына вялізарнага росту здарэньняў на Віцебскім вузьле? Мы лічым асноўнай прычынай росту здарэньняў тое, што да гэтага часу ні партарганізацыі, ні прафсаюзы ня здолелі наладзіць рашучай і бязьлітаснай барацьбы з п'янствам і прагуламі, якія маюць месца сярод пасобных рабочых чыгункі. Можна падаць безьліч фактаў, калі даяржава церпіць страты на дзесяткі тысяч рублёў толькі з-за таго, што той ці іншы рабочы, якому даручана весьці цягнік, прыходзіць на паравоз п'яным і г. д.

### Ячэйка пацiху ўгаварвае прагульшчыкаў

У трэцяй дзесяцідзёнцы ліпеня рабочыя паравозных брыгад прагулялі 8 рабочых дзён, у першай дзесяцідзёнцы жніўня прагулы паравозных брыгад дасягнулі 24 рабочых дзён, рабочыя бягучага рамонту ў 3-й дзесяцідзёнцы ліпеня прагулялі 24 рабочых дні, у першай дзесяцідзёнцы жніўня—60 рабочых дзён жандуктары прагулялі ў 3-й дзесяцідзёнцы ліпеня — 11 рабочых дзён, у першай дзесяцідзёнцы жніўня — 53 рабочых дні.

Сярод прагульшчыкаў, дэзэртыраў з фронту сацыялістычнага будаўніцтва ёсьць камуністыя і між іншым іх не адзінкі. Мы лічым, што чыгуначная партарганізацыя зусім мала змагаецца з камуністымі-прагульшчыкамі. У ячэйцы № 1 камуністых п'яніц, прагульшчыкаў выключаюць на бюро і паціху ўгаварваюць. П'яніца-прагульшчык **Балулін**, які на чыстцы атрымаў суровую вымову з папярэджаньнем за п'янку і прагулы, ня раз ужо выходзіў сухім з вады. «Камуністы» **Маскін**, які ня раз зьяўляўся на работу п'яным і прагуляў значны лік рабочых дзён, атрымаў ад бюро ячэйкі таварыскае «внушение».

Віцебскі вузел рабочымі быў абвешчаны ўдарным. Але ўдарных тэмпаў у рабоце няма. Саспаборніцтвам ахоплена «прыблізна» 60 проц. рабочых. Ні парткалектыў, ні вучрафсакож, ні мясцкомы ня ведаюць колькі рабочых спаборнічаюць намкі сабой, колькі з іх зьяўляюцца ўдарнікамі. У пасобных парт'ячэйках боль паловы камуністых не зьяўляюцца за гэтага часу ўдарнікамі. Саспаборніцтвам і ўдарным рухам ні партарганізацыі, ні прафсаюзы ня кіруюць.

### Парткалектыў заслухоўвае інфармацыю аб „чарговых задачах"

Удзел і кіраўніцтва партарганізацыі ў падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак выявіліся толькі ў тым, што партыйны калектыў на сваім пасяджэньні ў чэрвені месяцы заслухаў інфармацыю «аб чарговых задачах». Парткалектыў на працягу апошніх двух месяцаў не праверыў і не пацікавіўся холам падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак. Такія адносіны да выкананьня найважнейшых дырэктыў партыі мы лічым больш чым злачынымі. Апартуністычнае кіраўніцтва чыгуначнай віцебскай арганізацыі паказала сваю поўную няздольнасьць забясьпечыць пасьпяховую падрыхтоўку да асеньня-зімовых перавозак так, як і аказалася няздольным кіраваць сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам. Цікава, што паасобныя вытворчыя ячэйкі за апошняе паўгодзьдзе ні аднаго гаспадарчага пытаньня на сваіх пасяджэньнях і сходах не абмяркоўвалі. Гэта характарызуе тое, як чыгуначная партарганізацыя перабудавалася, як яна павярнулася тварам да вытворчасьці і як здолела забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне якасных паказальнікаў.

### У бюракратычнай шкарупіне

Прафсаюзы ня вылезьлі са сваёй бюракратычнай, казённай шкарупіны. Месяц таму назад вучпрафсожам была склікана нарада па пытаньні падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак. На нарадзе было заслухана... 30 дакладаў. Старшыня вучпрафсожу знайшоў «непатрэбным» адкрываць спрэчкі. Спрэчак ня было. Для старшыні вучпрафсожу ўсё зразумела. Якія могуць быць спрэчкі, бо будаўніцтва будзе скончана «днямі» (?).

Віцебскім акрпрафбюро на вузел была накіравана рабочая брыгада для дапамогі прафарганізацыі ў падрыхтоўцы да перавозак. Чыноўнікі з вучпрафсожу разьмеркавалі брыгадзіраў наступным чынам: аднаго прымацавалі да пажарнага дэпо (?), другога—да кіноваагону (??) і апошняга прымацавалі да школы ФЗВ. Такім чынам, ні адзін брыгадзір ня быў накіраваны на вытворчасьць, дзе-б ён мог выкрыць марудныя, недапушчальныя тэмпы ў падрыхтоўцы да перавозак. Карацей кажучы, вучпрафсож зрабіў так, каб брыгадзіры ня бачылі і ня ведалі пра тую работу, якая вядзецца да перавозак.

### Патрэбны тэрміновыя меры

Мы лічым, што патрэбны тэрміновыя і рашучыя меры па аздараўленьні кіраўніцтва на Віцебскім чыгуначным вузьле.

Рабочыя-чыгуначнікі Віцебскага вузла будуць трымаць экзамэн перад партыяй і краінай у правядзеньні асеньня-зімовых перавозак. Мы ўпэўнены, што гэты экзамэн рабочыя-чыгуначнікі вытрымаюць.

Ул. Мяжэвіч.

# Пачалося абсьледваньне падрыхтоўкі с.-г. кадраў

### *Прыцягнуць шырокія масы на дапамогу ЦКК РСІ ў гэтым абсьледваньні*

## Што трэба выявіць

Вялізарны размах сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі ва ўсю шырыню ставіць праблему падрыхтоўкі сельска-гаспадарчых кадраў. Лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б) даў канкрэтныя дырэктывы па гэтым пытаньні. 16 партзьезд у сваёй рэзалюцыі па дакладзе ЦККК УсеКП(б) даручыў ЦККК РСІ сыстэматычна кантраляваць выкананьне пастаноў партыі па падрыхтоўцы новых кваліфікаваных кадраў, скарыстаньні іх на практычнай рабоце.

Зараз ЦККК РСІ прыступіла да абсьледваньня падрыхтоўкі кадраў для сельскае гаспадаркі.

Што павінна выявіць гэта абсьледваньне?

Яно павінна выявіць, як выконваюцца пастановы ліпеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб падрыхтоўцы тэхнічных кадраў, што зроблена ў справе рэарганізацыі сыстэмы сельска-гаспадарчае асьветы, у справе плянаваньня падрыхтоўкі сельска-гаспадарчых кадраў.

Абсьледваньне павінна выявіць практычную дзейнасьць кіраўнічых і апэрацыйных арганізацый і ўстаноў па падрыхтоўцы с.-г. кадраў (ад навуковых работнікаў да кадраў ніжэйшай кваліфікацыі) з пункту погляду новых заданьняў пяцігодкі сельскае гаспадаркі.

Будучь абсьледваны пытаньні сеткі навучальна-дасьледчых устаноў і сельска-гаспадарчых навучальных устаноў (вышэйшая, сярэдняя і ніжэйшая) іх структура, спэцыялізацыя з боку заданьняў сельскае гаспадаркі адпаведнымі тыпамі с.-г. спэцыялістых. Абсьледваньне выявіць склад студэнцтва сельска-гаспадарчых навучальных устаноў БССР, зьмены гэтага складу за апошнія тры гады, выпуск кадраў з сельска-гаспадарчых навучальных устаноў, суадносіны гэтых кадраў па асобных спэцыяльнасьцях і кваліфікацыі.

Абсьледваньне закране пытаньне аб формах і мэтадах навучальнай работы: характар навучальных плянаў і праграм у адпаведнасьці з іх задачамі падрыхтоўкі адпаведных тыпаў сельска-гаспадарчых спэцыялістых. ЦК забясьпечана вывучэньне грамадзкіх дысцыплін і марксыцка-ленінская мэтадалёгія і выкладаньне. Папярэднія матар'ялы гавораць за тое, што ня ўсюды гэтая справа стаіць добра. Важна высьвятліць ступень спэцыялізаванасьці навучальных праграм, увядзеньне актыўных мэтадаў выкладаньня, вывучыць пытаньне ўвязкі тэарытычнай падрыхтоўкі з практычнай.

Ня менш актуальным пытаньнем зьяўляецца пытаньне сыстэмы па-за школьнага распаўсюджаньня с.-г. ведаў і падрыхтоўка работнікаў для сельскае гаспадаркі ў Чырвонай арміі.

Ня будуць абыйдзены і такія пытаньні: забясьпячэньне навуковым інструмэнтарыям, абсталяваньнем, неабходнымі станцыямі, лабараторыямі і майстэрнямі; будаўніцтва і рамонт, матар'яльнае забясьпячэньне і культурна-бытавое абслугоўваньне вучняў, забясьпячэньне пэдагагічным пэрсаналам, падрыхтоўка пэдагагічных кадраў, разгортваньне сельска-гаспадарчых навучальных устаноў на прадпрыемствах.

Прымаючы пад увагу вялікую патрэбнасьць у сельска-гаспадарчых кадрах, будуць вывучаны пытаньні сыстэмы масавай паскоранай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі спэцыялістых сельскае гаспадаркі, пытаньні арганізацыі першапачатковай сельска-гаспадарчай адукацыі. Кароткатэрміновыя курсы, сетка школ калгаснай моладзі, яе рост і мэтавая ўстаноўка ў сувязі з характарам і напрамкам сельскае гаспадаркі данага раёну.

Вось тыя вузлавыя пытаньні, якія будуць абсьледвацца.

Сіламі работнікаў НК РСІ правесьці гэту работу няма магчымасьці. У гэтай рабоце павінна прыняць удзел шырокая пралетарская грамадзкасьць, камсамол, студэнцтва, спэцыялістыя, кансультанты, прафэсура, асьпіранты. У першую чаргу ўстановы і арганізацыі, якіх датычыць гэта справа зараз павінны ўзяцца за самаправерку, прыцягнуць да гэтага шырокую грамадзкасьць. Сэкцыя навуковых работнікаў павінна вылучыць патрэбную колькасьць спэцыялістых; загадчыкі навуковых і навучальных устаноў праз друк павінны паведаміць аб сапраўдным становішчы тых устаноў, дасьлаць матар'ял у НК РСІ. Наркамзем, Наркамасьветы, адначасова з абсьледваньнем, павінны будуць на ходу выправіць свае памылкі ў справе падрыхтоўкі сельска-гаспадарчых кадраў.

Рабкоры, насьцёнкоры, селькоры павінны мабілізаваць сваю энэргію для пасьпяховага правядзеньня гэтага абсьледваньня.

У заключэньне трэба адзначыць, што падрыхтоўка сельска-гаспадарчых кадраў раней была нездавальняючай. Таму шырокія колы савецкай грамадзкасьці, рабочыя, батракі, беднякі і калгаснікі на сваіх сходах павінны абмеркаваць даклады адпаведных кіраўнічых і навучальных устаноў аб іх рабоце.

Усе матар'ялы да абсьледваньня—накіроўваць у НК РСІ—групе сацыяльна-культурных пытаньняў.

А. Нікалаеў.

# Зрыў навучальнага году забясьпечаны

### Хто зьверне ўвагу на Гомельскі лясны інстытут

**Пастанова Саўнаркому БССР патрабавала пераезду лясного інстытуту ў Гомель да 1-га жніўня. Адбыўся дзялёж катэдраў і маемасьці з Горацкай Акадэміяй, упакавана да адпраўкі большая частка рэчаў. Навуковыя работнікі чакаюць пераезду. А ГОМЕЛЬ ІНСТЫТУТУ ЯШЧЭ НЯ ПРЫНЯЎ І КАЛІ БУДЗЕ РАЗЬМЕШЧАНЫ ІНСТЫТУТ—НЕВЯДОМА.**

**Тры рэчы адыгрываюць для жыцьця інстытуту важнейшую ролю: І. Будынкі для навучальнай плошчы, 2) інтэрнаты для студэнтаў, 3) кватэры для навуковых работнікаў.**

**Дагэтуль у Гомелі займаліся толькі гаворкамі пра інстытут. Таму ня толькі цэлага дому, але НАВАТ МАЛЕНЬКАЙ КАМОРКІ НЕ ПРАДАСТАЎЛЕНА ІНСТЫТУТУ ДА ГЭТАГА ЧАСУ.**

**Неабходна ў плянавым парадку вызначыць інстытуту патрэбную плошчу. Даручыць гэтую справу пэўным асобам, якія будуць за яе адказваць.**

**М. Сівадзелаў.**

# Змагацца за палітэхнізм!

**Склясьці пляны рэарганізацыі школ у ФЗС, ШКМ і наблізіць іх да фабрык, заводаў, саўгасаў і калгасаў.—Неадкладна пачаць падрыхтоўку да палітэхнічнага зьезду.—Задачы палітэхнізму вынесьці на шырокае абмеркаваньне рабочых мас.**

У сваёй пастанове ад 25 ліпеня 1930 году ЦК нашай партыі адзначыў, што тэмпы рэалізацыі патрабаваньняў праграмы партыі аб абавязковай усеагульнай **палітэхнічнай** адукацыі зусім нездавальняючыя, і што ўся сыстэма народнай асьветы, асабліва, масавая школа, усё яшчэ хварэе адарванасьцю ад вытворчасьці.

Адсюль выцякае асноўная задача перабудовы сыстэмы народнай асьветы на даным этапе — палітэхнізацыя ўсіх зьвеньняў сыстэмы народнай асьветы.

Гэтая праблема зьяўляецца адной з важнейшых гаспадарча - палітычных праблем нашага будаўніцтва. Сутнасьць палітэхнізму вызначана праграмай нашай партыі «як знаёмства ў тэорыі і на практыцы з галоўнымі галінамі вытворчасьці».

Тав. Ленін у сваіх заметках па тэзісы т. Крупскай гаворыць: «Бязумоўным заданьнем паставіць безадкладны пераход да палітэхнічнай асьветы, або, правільней, безадкладнае ажыцьцяўленьне раду даступных зараз крокаў да палітэхнічнай асьветы, як-та: разам з Гоэрло: а) наведваньне электрычных станцый бліжэйшых і рад лекцый з досьледамі па іх; **рад практычных работ**, якія толькі магчымы з электрычнасьцю; распрацаваць зараз-жа дэтальныя праграмы (на адно наведваньне, на курс у 5-10 лекцый, у адзін-два месяцы і г. д.); б) тое-ж кожны добра пастаўлены саўгас; в) тое-ж кожны добра пастаўлены завод. Разам з Гоэрло—г) мабілізацыя для лекцыі па электрычнасьці і палітэхнічнай асьвеце, кіраўніцтва практычнымі заняткамі, паездак і інш. усіх інжынэраў, аграномаў, усіх кончуўшых унівэрсытэт па фізыка-матэматычным факультэце; д) набудова маленькіх музэяў па палітэхнічнай асьвеце, цягнікоў, параходаў і інш. Гэта архіважна».

Ленінская ідэя палітэхнічнай асьветы, якая зьяўляецца арганічнай часткай камуністычнага выхаваньня павінна быць безадкладна ператворана ў жыцьцё, што можа быць выканана толькі пры выразным плане дзеяньняў усіх гаспадарчых арганізацый і ў першую чаргу органаў народнай асьветы.

Рашучая барацьба супроць славеснаначотніцкай школы, супроць тэндэнцый рамесьніцва, арганічная сувязь школы з вытворчасьцю на аснове прадукцыйнасьці дзіцячай працы і грамадзка-карыснай работы, уключэньне школ у агульны фронт сацыялістычнага будаўніцтва і клясавай барацьбы, мабілізацыя грамадзкай пралетарскай думкі і патрэбных матар'яльна-фінансавых сродкаў — вось тыя асноўныя задачы, якія патрабуюць адзінага пляну дзеяньня ўсіх партыйных, грамадзкіх, гаспадарчых, камсамольскіх і прафэсыйных арганізацый у справе неадкладнага ажыцьцяўленьня палітэхнізацыі школы.

Між тым, пытаньне ажыцьцяўленьня пастаноў партыі ў галіне палітэхнізацыі школы ў БССР знаходзіцца на такой ступені выраўнаньня, што ёсьць рэальная небясьпека зрыву гэтай важнейшай палітыка-гаспадарчай задачы.

Мы з упэўненасьцю можам сказаць, што **ні адна з арганізацый, якія павінны былі быць зацікаўлены ў гэтым пытаньні — НКА, ВСНГ, НКЗ, прафсаюзы, камсамол — не заняліся пабальшавіцку гэтай справай.** Ня гледзячы на тое, што навучальны год ужо надыходзіць, **ніякіх канкрэтных мерапрыемстваў у справе палітэхнізацыі не намечана,** і месцы ня ведаюць з чаго пачаць. Няма канкрэтнага пляну рэарганізацыі школ у ФЗС, ШКМ, ШКС і прымацаваньне іх да заводаў, фабрык, прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў, б) у прамфінпляне прадпрыемстваў ня ўлічаны сродкі па палітэхнізацыі школ, в) не разгорнута папулярызацыя ідэй палітэхнізму сярод пралетарскай грамадзкасьці, г) няма кантрольных лічбаў палітэхнізацыі школ на 1930-31 год, в) няма адзінага пляну ў дзеяньні ВСНГ, НКЗ, НКА.

**ВСНГ, НКЗ, прафсаюзы стаяць у баку ад гэтай важнейшай задачы.** Камсамольская арганізацыя Беларусі, ня гледзячы на цэлы рад дырэктыў ЦК УсеЛКСМ, самым супакойным чынам спачывае на лаўрах, замест таго, каб пабальшавіцку змагацца за палітэхнізм.

**Работа НКА у гэтай галіне далёка нездавальняючая.** Друк не мабілізаваны. Падрыхтоўка да зьезду зусім нездавальняючая. Ня вызначаны яшчэ дасканалы тэрмін скліканьня яго, гэта ў той час, калі ўсе нізавыя арганізацыі і ўсё настаўніцтва чакае канкрэтных практычных указаньняў.

Неабходна зараз-жа ўзмацніць тэмпы па правядзеньні ў жыцьцё пастаноў партыі ў галіне палітэхнізацыі школы. Трэба правесьці наступныя мерапрыемствы.

**1. Склікаць першы ўсебеларускі зьезд па палітэхнічнай асьвеце не пазьней 10 верасьня, склікаўшы папярэднія раённыя канфэрэнцыі па палітэхнічнай асьвеце.**

2. У парадак дня зьезду павінны быць уключаны наступныя пытаньні: а) зьезд і формы палітэхнічнай школы; б) падрыхтоўка кадраў і значэньне ФЗС, ШКС і ШКМ (даклады ВСНГ і НКЗ); в) задачы прафсаюзаў у палітэхнізацыі школы; г) разбор праграм і мэтадаў палітэхнізму ў асобных зьвеньнях сыстэмы, у сэкцыях.

3. Тэзісы дакладаў павінны быць не пазьней 5 верасьня.

4. Да ўдзелу ў зьезьдзе павінны быць шырока прыцягнуты рабочыя, нізавое настаўніцтва, інжынэрна-тэхнічны і агранамічны пэрсанал, дырэктары прадпрыемстваў і саўгасаў.

5. Друк павінен быць мабілізаваны для падрыхтоўкі папулярызацыі і абгаварваньня пытаньняў зьезду.

Трэба правесьці перад гэтым цэлы **рад сходаў на фабрыках, заводах, саўгасах, калгасах, сярод рабочай моладзі і дзетвары з дакладамі аб ролі і задачах палітэхнізацыі школы.**

7. Трэба зараз-жа **распрацаваць адзіны плян дзеяньня ўсіх арганізацый у выглядзе заключэньня генэральнага дагавору (па тыпу Сібіры) паміж НКА, ВСНГ, НКЗ, ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ.**

8. Трэба зараз-жа прымацаваць школы да заводаў, фабрык, саўгасаў і калгасаў.

9. Высунутыя Першым Усерасійскім Палітэхнічным зьездам пытаньні аб арганізацыі вырабу стандартнага абсталяваньня для палітэхнічнай школы, павінны знайсьці сваё прамленьне і ў нашых умовах. **ВСНГ БССР павінен абсталяваць такія фабрыкі, у прыватнасьці пераабсталяваць фабрыку цацак для палітэхнічных мер.**

10. **Усебеларуская выстаўка павінна быць скарыстана для мэт палітэхнічнай асьветы.**

Палітэхнізацыя школы, апроч стварэньня матар'яльна фінансавай базы, адпаведнай дапамогай, праграмамі і падручнікамі, мае патрэбу і ў палітэхнічнай падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы пэдагагічных кадраў. Пад гэтым кутом погляду **павінны быць перагледжаны ўсе навучальныя пляны пэдтэхнікумаў, пэдінстытутаў і пэдфаку.**

Больш рашуча вылучаць на кіраўніцтва ФЗС, ШКС і ШКМ высока-кваліфікаваных рабочых, інжынэрна-тэхнічных і агранамічных пэрсанал. Арганізаваць кароткатэрміновыя пэдкурсы для гэтых асоб — адна з баявых задач.

Толькі такім шляхам, шляхам мабілізацыі ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, друку, гаспадарчых і інш. арганізацый мы зможам пабальшавіцку выканаць важнейшую гаспадарча-палітычную задачу — палітэхнізацыю школы.

ЧАРНАБРОДАЎ.

*Партыйнае будаўніцтва*

# Хутка пачнецца зімовы пэрыяд партвучобы

### *Забясьпечыць кадрамі прапагандыстых, літаратурай, матар'ялямі ўсю сетку партасьветы*

Праз вывучэньне марксыцка-ленінскай тэорыі падвысім ідэйна-палітычны ўзровень партыйных мас, паднімем на вышыню бальшавіцкай прынцыповасьці барацьбу супроць правага і „левага" апартунізму як у тэорыі, так і на практыцы.

# Пара рыхтавацца

Паводле пастановы Ўсебеларускае Культнарады заняткі ў пачатковых зьвеньнях партасьветы павінны пачацца 1-га, а ў сярэдніх і вышэйшых — 15-га кастрычніка.

Да пачатку навучальнага году засталося зусім мала часу. Яго трэба поўнасьцю скарыстаць для ўкамплектаваньня сеткі, падбору прапагандысцкіх кадраў, забясьпячэньня школ і гурткоў памяшканьнямі, навучальнымі прыладамі і абсталяваньнем.

Работа ўсяе сеткі партыйнае асьветы павінна быць падначалена вырашэньню тых новых задач, якія высоўваюцца пэрыядам разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсяму фронту. Гэтымі задачамі павінен вызначацца і зьмест партыйнае асьветы. «Новая практыка пораджае новы падыход да праблем у эканоміцы пераходнага пэрыяду. Па-новаму ставіцца зараз пытаньне аб нэпе, аб клясах, аб тэмпах будаўніцтва, аб змычцы, аб палітыцы партыі. Каб не адставаць ад практыкі, трэба заняцца зараз-жа распрацоўкай усіх гэтых праблем з пункту погляду ньсьвай абстаноўкі. Бяз гэтага немагчыма перамога над буржуазнымі тэорыямі, якія засьмечваюць галовы нашым практыкам» (Сталін).

Асноўнымі задачамі сыстэмы партыйнае асьветы зьяўляецца **прапаганда пастаноў XVI і XIII зьездаў партыі,** змаганьне за яе генэральную лінію супроць правага і «левага» апартунізму ў тэорыі і на практыцы і прымірэнцтвам да іх, змаганьне з буржуазнымі і дробнабуржуазнымі тэорыямі.

Агень марксыцка-ленінскай тэорыі павінен быць накіраваны на бязьлітаснае змаганьне з вялікадзяржаўным шавінізмам, найбольш небясьпечным на даным этапе, на змаганьне з беларускай нацыянал-дэмакратычнай контр-рэвалюцыяй, саюзьнікам інтэрвэнтаў і шавінізмам розных колераў і адценьняў.

У цэнтры ўвагі ўсяе сеткі партыйнае асьветы павінна стаяць задача на асьвятленьні пытаньняў палітыкі, тактыкі і задач Камінтэрну ва ўмовах сусьветнага крызісу імпэрыялістычнай сыстэмы і новага рэвалюцыйнага ўздыму. Партыйныя арганізацыі павінны разгарнуць работу па ўцягненьні ў сетку масавае партыйнае асьветы масы кандыдатаў у члены партыі і шырокі беспартыйны рабочы і калгасны актыў. У сярэднія і вышэйшыя зьвеньні партасьветы неабходна ўцягнуць усю партарганізацыю. Важнейшай задачай кожнай партарганізацыі зьяўляецца ажыцьцяўленьне лёзунгу — **усе 100 проц. камуністых за марксыцка-ленінскую вучобу. Укамплектаваньне сеткі партыйнае асьветы павінна быць праведзена, як масавая палітычная кампанія.**

Актуальнейшая задачай партарганізацыі пры набудове сеткі партасьветы зьяўляецца **паварот усёй сыстэмы партасьветы тварам да сяла — да раёну.** Ліквідацыя акруговага зьвяна партыйнага кіраўніцтва патрабуе ўзмацненьня арганізацыйнага і мэтадычнага кіраўніцтва партвучобай з боку райкомаў КП(б)Б і павышае адказнасьць раённай сеткі партасьветы ў справе тэарытычнай падрыхтоўкі кіруючых кадраў партыйнага актыву. Гэта таліна павінна перастаць быць «вузкім месцам» нашай унутрыпартыйнай работы.

Раённыя партарганізацыі павінны так арганізаваць перападрыхтоўку і падрыхтоўку актыву, каб ня толькі задаволіць, але і перакрыць усе запатрабаваньні раённай і нізавой работы.

Неабходна самым рашучым чынам пакончыць з недаацэнкай тэарытычнае вучобы. Гэта недаацэнка вядзе да бясплянавага дзяляцтва ва ўсёй рабоце.

Адзін з сакратароў райкому партыі заяўляе: «складзеныя пляны вучобы нерэальныя, пам няма часу вучыцца, мы заняты кампаніямі і г. д.». Гэткае бяспрынцыповае дзяляцтва, няўменьне і нежаданьне ўвязаць правядзеньне палітычных кампаній з марксыцка-ленінскай вучобай, сустракаецца вельмі часта і з гэтым трэба рашуча пакончыць.

Справе разгортваньня марксысцка-ленінскае вучобы надзвычай спрыяе новая сыстэма пачатковай партыйнай асьветы.

Замест нармальнай школы палітграматы з гадовым курсам навучаньня, у гэтым годзе ўводзіцца **3-4 месячная пачатковая школа** ў горадзе і ў вёсцы **з бязупынным каплектаваньнем,** якая падводзіць слухачоў да набыцьця агульна-палітычных ведаў, праграмы партыі, абавязкаў членаў партыі на падставе вывучэньня актуальных бягучых задач сацыялістычнага будаўніцтва і партыйнае работы. Для гэтага міркуецца арганізаваць выданьне падручніка—часопісі, які забясьпечыць сетку партвучобы найбольш актуальным матар'ялам.

Сыстэма партыйнае асьветы максымальна набліжаецца да раёну, у прыватнасьці і па лініі тэарытычнай вучобы актыву. У сямі раёнах міркуецца арганізаваць аддзяленьні вячэрняга КУБ'а, а ў 20 раёнах сыстэматычныя штодэкадныя тэарытычныя лекцыі і даклады.

Пры разгортваньні сеткі партыйнае асьветы надзвычайна востра паўстае **праблема прапагандысцкіх кадраў.**

У працягу лета праведзены рад курсаў рабочых прапагандыстых (у Менску, Воршы і Гомелі), курсы вясковых прапагандыстых (у б. Менскай акрузе). Але гэтыя курсы ні ў якім разе не задаволяць прапагандысцкімі сіламі запатрабаваньняў сеткі партыйнае асьветы.

Партарганізацыям неабходна **зараз-жа прыступіць да падбору прапагандыстых.**

Апрача скарыстаньня студэнцтва і выкладчыкаў Камвузу, ВНУ і інш. навучальных устаноў трэба праводзіць далейшае рашучае **высоўваньне новых прапагандыстых** з ліку актыву камуністых-рабочых, старых партыйцаў, адказных работнікаў, арганізоўваючы сэмінары і спэцыяльныя курсы для іх падрыхтоўкі.

Якасьць партасьветнае работы ў значнай ступені залежыць ад правільнага мэтадычнага кіраўніцтва. У напрамку разьвязваньня гэтай важнейшай задачы, актуальнае значэньне набывае пастанова Ўсебеларускай Культнарады аб арганізацыі партгабінэтаў ва ўсіх раёнах і на буйных прадпрыемствах, якія павінны весьці мэтадычную работу па мясцох.

Задача разгортваньня бальшавіцкага выхаваньня шырокіх партыйных мас і беспартыйнага рабочага актыву, узбраеньне іх марксысцка-ленінскай тэорыяй для правядзеньня складнейшай адказнай работы па сацыялістычнай рэканструкцыі народнае гаспадаркі будзе разьвязана толькі пры ўмове ўзмоцненага партыйнага кіраўніцтва работай па ўкамплектаваньні сеткі партасьветы пры **ўмове ўцягненьня ў гэтую справу ўсіх членаў партыі.**

М. МОДЭЛЬ.

# Хроніка падрыхтоўкі

### Кадры прапагандыстых

26 жніўня адбудзецца выпуск курсантаў менскіх прапагандысцкіх курсаў. Курсы скончыла 45 таварышоў, усе яны будуць накіраваны прапагандыстымі на фабрыкі і заводы.

З 1-га жніўня пры культпропе ЦК КП(б)Б пачалі працаваць цэнтральныя курсы прапагандыстых, якія рыхтуюць кіраўнікоў для вячэрніх саўпартшкол. На курсах займаецца 50 чалавек.

Культпропе ЦК КП(б)Б даў дырэктыву ўсім райкомам КП(б)Б аб неабходнасьці арганізацыі каротка - тэрміновых курсаў, арганізатараў партвучобы па прадпрыемствах.

ЦК КП(б)Б міркуе правесьці дэкадныя курсы для работнікаў, якія пасылаюцца ў раёны.

### Падручнікі і матар'ялы

Культпропе ЦК КП(б)Б будзе выдаваць часопісь - падручнік для пачатковых партшкол і гурткоў бягучай палітыкі. Часопісь будзе выходзіць штомесячна.

Да пачатку навучальнага году будуць выданы наступныя падручнікі: «Памятка бальшавіка» — Кержанцаў—для пачатковай школы ў горадзе і на вёсцы; «Азбука ленінізму» — Кержанцава і Леонцьева — для гарадзкіх партшкол і «Азбука ленінізму» — Альховага — для вясковых партшкол.

Цэнтральны Дом камуністычнай асьветы рыхтуе альбом дыяграм для сеткі партасьветы, у якім адлюстроўваецца сацыялістычнае будаўніцтва БССР. Альбом міркуецца выдаць у сярэдзіне верасьня м-ца.

# Манэўры--баявы экзамэн

### Савецкая грамадзкасьць, падрыхтоўкай да манэўраў выканаем пастановы XVI зьезду!

Чырвоная армія на надыходзячых манэўрах прадэманструе свае дасягненьні, якія яна мае ў сваёй тактычнай і тэхнічнай падрыхтоўцы, у справе аўладаньня мэт

# У ЧЫІХ РУКАХ СЬЦЯГ ПЕРАМОГІ?

## ХТО УПЕРАДЗЕ? ХТО ЗОЙМЕ ГАНАРОВАЕ МЕСЦА СЯРОД ЛЕПШЫХ З ЛЕПШЫХ?

**ЛЕПШАЕ прадпрыемства—перавыкананае плян другога году пяцігодкі, на падставе „сустрэчнага прамфінпляну", складзе максымальныя кантрольныя лічбы і забясьпечыць іх выкананьне.**

*Пралетары БССР адкажэце на выклік сталінцаў*

**30 ВЕРАСЬНЯ—ДЗЕНЬ УСЕСАЮЗНАЙ ПАДРЫХТАВАНАСЬЦІ ДА СУСТРЭЧЫ НОВАГА ГАСПАДАРЧАГА ГОДУ.**

*Праз „сустрэчны прамфінплян" да пяцігодкі за 4 гады*

**КОНКУРС—гэта заклік да мабілізацыі сіл і энэргіі рабочае клясы. Гэта—агляд перад новымі баямі, за новыя перамогі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.**

## ПАКАЗ БАЛЬШАВІЦКАГА НАЦІСКУ

«Правда» публікуе адозву рабочых заводу імя Сталіна ў Ленінградзе да ўсіх рабочых СССР аб арганізацыі ЎСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСА ЛЕПШЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ.

Новая ініцыятыва перадавога атраду пралетараў—рабочых Папюстроўскага гіганта ў Ленінградзе—мае бязумоўна ВЯЛІКАЕ ПАЛІТЫЧНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ, гэта яшчэ адна цяжкая гіра на шальку вагі, якая вырашыць пёс «пяцігодкі—за чатыры гады».

У конкурсе могуць удзельнічаць ЛЕПШЫЯ. Што гэта азначае? Гэта азначае, што кожны завод, кожная фабрыка, кожнае прадпрыемства, якое захоча стаць у шэраг перадавых, павінна будзе ПАДЦЯГНУЦЦА, ліквідаваць свае прарывы, узьняць грамадзкую работу ўнутры прадпрыемства на нябывалую вышыню, яшчэ шырэй разгарнуць спаборніцтва і ўдарніцтва, яшчэ больш вывяць усе захаваныя рэзэрвы вытворчасьці і абвясьціць бязьлітаснае змаганьне ўсяму, што цягне гэтае прадпрыемства назад, у рады тых, хто адстае.

Бязумоўна, імкненьне ўдзельнічаць у конкурсе і атрымаць даволі салідную прэмію, ня толькі ганаровую (пераходны сьцяг), але і матар'яльна выгадную, павінна будзе прывесьці ДА ШЫРОКАЙ МАСАВАЙ ПРАПРАЦОЎЦЫ СУСТРЭЧНЫХ ПРАМФІНПЛЯНАЎ, да арганізацыі ў першую чаргу ЎНУТРЫЗАВОДЗКІХ КОНКУРСАЎ ПАМІЖ ПААСОБНЫМІ МАЙСТЭРНЯМІ, ЦЭХАМІ, БРЫГАДАМІ.

Пытаньне аб заахвочваньні ўдарнікаў ставілася ня раз нашымі прафсаюзнымі арганізацыямі, але да гэтага часу яны ня здолелі яго як сьлед правесьці ў жыцьцё. ФОНД ПРЭМІЯВАНЬНЯ ЛЕПШЫХ ЗАВОДАЎ І ФАБРЫК СТВОРАНЫ, ПАВОДЛЕ ПАСТАНОВЫ ВСНГ СССР, У СУМЕ 50 МІЛ. РУБ., ДАГЭТУЛЬ НЕ СКАРЫСТАНЫ. Мала таго, т. Швэрнік на XVI зьезьдзе партыі падаваў прыклады, калі прэміяваньне рабочых ператвараецца на справе ў зьдзекваньне з іх.

Конкурс, які прапануюць рабочыя заводу імя Сталіна, ставіць пытаньне аб заахвочваньні лепшых прадпрыемстваў на зусім рэальную глебу.

Вось у ясноўным палітычнае і гаспадарчае значэньне конкурсу лепшых.

Уключыцца ў гэты конкурс, атрымаць права ўдзельнічаць у гэтым конкурсе—зробіцца для кожнага прадпрыемства «справай гонару, справай славы, справай гэройства».

## Ударнікі Менску—за актыўны ўдзел у конкурсе

### Вітаем ініцыятыву Ленінградзкіх рабочых

**Тав. Платонаў—рабочы заводу „Камунар"**

— Адозва рабочых заводу імя Сталіна яшчэ больш зьвяжа ўсе заводы і дапаможа абмяняцца вопытам іх работы. Можна толькі вітаць прапанову ленінградцаў аб прэміяваньні лепшых заводаў пабудовай сталовых, ясьляй і г. д. **Гэтыя прэміі таксама паслужаць у далейшым лепшаму выкананьню прамфінпляну.**

**Мілюкоўскі і Кузьмін—ударнікі абутковай фабрыкі**

— У нашу фабрыку за апошні час улілося шмат новых рабочых, з якімі **не вядзецца ніякай растлумачальнай работы па ўцягненьні іх ва ўдарныя брыгады.** Рабочыя яшчэ не мабілізаваны на лепшае выкананьне прамфінпляну. Зараз мы зможам гэтага дабіцца **пры правядзеньні растлумачальнай работы аб адозве рабочых заводу імя Сталіна.** Трэба, каб нашы партыйныя і грамадзкія арганізацыі **азнаёмілі ўсіх рабочых з гэтым выклікам.**

**Гарэлік і Кацэнэльсон—ударнікі абутковай фабрыкі**

— Мы зусім згодны з рабочымі заводу імя Сталіна, якія прапануюць **30 верасьня абвясьціць днём усесаюзнай гатоўнасьці, днём перамогі працы. Нашы ўдарныя брыгады таксама павінны падрыхтавацца да гэтага дня.**

У нас да гэтага часу ўсё яшчэ дрэнна рэалізуюцца рабочыя прапановы. Грамадзкія арганізацыі яшчэ не павярнуліся тварам да вытворчасьці. **Прапрацоўка выкліку ленінградзкіх рабочых дасьць нам магчымасьць зьнішчыць гэтыя недахопы.**

**ударнікі швэйнай фабрыкі „Кастрычнік"—Каган, Кауфман і Зархін**

— Наша фабрыка за 10 месяцаў свой прамфінплян перавыканала. Зараз пачынаем складаць «сустрэчны прамфінплян», які яшчэ больш павялічвае выпуск прадукцыі. **Але і гэты прамфінплян перавыканаем.** Мы паставім перад нашымі партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі пытаньне аб яшчэ большым разгортваньні масавай работы, каб стаць адным з лепшых фабрык і атрымаць чырвоны сьцяг. **У гэтай рабоце мы нашым арганізацыям дапаможам.**

**Ударнікі фабрыкі „Кастрычнік"—Цукерман і Іваноў**

— Выклік рабочых заводу імя Сталіна да ўсіх рабочых СССР бясспрэчна ўзьніме зацікаўленасьць і нашых рабочых да выкананьня вытворчых заданьняў. Выклік гэты забясьпечыць уцягненьне ва ўдарныя брыгады ўсіх рабочых фабрыкі. Наша імкненьне дабіцца перамогі яшчэ больш узмацняецца пасьля выкліку рабочых заводу імя Сталіна.

**Тав. Філіповіч—сьлесар зборачнага цэху заводу „Энэргія"**

— Можна толькі пахваліць ініцыятыву ленінградзкіх рабочых — заводу імя Сталіна. **Адозва ўзьніме рабочыя масы на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.** Конкурс на лепшыя прадпрыемствы дасьць магчымасьць падцягнуць тых, якія адстаюць, і ўцягнуць усіх рабочых ва ўдарныя брыгады і сацспаборніцтва.

## АРГАНІЗУЕМ ВЫТВОРЧА-ГАСПАДАРЧЫ КОНКУРС

### З адозвы рабочых заводу імя Сталіна да ўсіх рабочых СССР

Для таго, каб вышэй быў уздым хвалі пралетарскага энтузіязму, для таго, каб мацней ударыла яна па асновах старога сьвету, мы, рабочыя заводу імя Сталіна, па пачыну нашых перадавікоў-ударнікаў прапануем арганізаваць **конкурс-спаборніцтва лепшых прадпрыемстваў.**

Лепшыя будуць спаборнічаць з лепшымі. Практыку **самых лепшых** выкарыстаюць ўсе прадпрыемствы Савецкага Саюзу.

Такія, напрыклад, заводы і фабрыкі, як маскоўскія Амо, Дынама, Электрасталь, Дняпрапятроўскі завод імя Дзяржынскага, Растоўскі Сельмаш, Ленінградзкі «Красный Путиловец», Каменская папяровая фабрыка, Муромскі паравозабудаўнічы завод, Уфімскія чырвонасьцяжныя майстэрні, наш завод імя Карла Маркса — маюць дасягненьні, якімі можа ганарыцца край Саветаў і ўвесь сусьветны пралетарыят.

Але, хто з іх лепшы? Хто ідзе ўперадзе? У каго ў руках сьцяг перамогі?

Мы думаем, што ў гэтым конкурсе павінны прыняць удзел сапраўды ўсе лепшыя прадпрыемствы, незалежна ад таго, які вучастак фронту сацыялістычнага будаўніцтва яны займаюць.

Заводы цяжкай металюргічнай прамысловасьці; рудзікі, капальні, нафтапромыслы; тэкстыльныя фабрыкі, прадпрыемствы хэмічнай прамысловасьці, прадпрыемствы транспарту; нашы новыя будаўніцтва — **павінны быць прадстаўлены ў гэтым конкурсе лепшых.** Мы думаем, што **калгасы і саўгасы** таксама павінны ўключыцца ў гэты конкурс, паказаць свае дасягненьні і перамогі.

Хто-ж лепшы? Лепшымі мы лічым тых, хто **па ўсіх паказальніках перавыканаў прамфінплян другога году пяцігодкі, хто склаў максымальны прамфінплян трэцяга году пяцігодкі на аснове арганізацыі сустрэчнага прамфінпляну.**

Гэта першая ўмова для ўдзельнікаў конкурсу.

Тэрмін конкурса — **6 месяцаў,** пачынаючы з **1 кастрычніка,** у працягу якіх прадпрыемствы, якія прымаюць удзел у конкурсе, абавязаны разьвіць бурны націск па ўсіх галінах вытворчай масавай работы. **Праз паўгода,** 1-га красавіка 1931 г. — «Правда» павінна абвясьціць вынікі, паказаць краю лепшых і прэміяваць іх за баявую работу.

Няхай гэты конкурс зьявіцца паказам бальшавіцкага націску:

— Колькаснае і якаснае выкананьне праграмы выпуску прадукцыі.

— Мінімум браку.

— Максымум зьніжэньня сабекошту.

— Перабудова работы гаспадарчых арганізацый і выкананьне дырэктывы ЦК аб адзіначальні.

— Поўны кавапот прафработы тварам да вытворчасьці.

— Арганізацыя культработы мэтаімкненай да вырашэньня вытворчай задачы.

— Перабудова партыйнай работы з тым, каб партарганізацыі і прафарганізацыі па-баявому кіравалі энтузіязмам і творчасьцю мас.

— Стварэньне і ўзмацненьне кадраў пралетарыяту.

— Цьвёрдае кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам з наяўнасьцю дакладнага вучоту вынікаў і аб'ектаў спаборніцтва.

— Давядзеньне пляну да варштату, да агрэгату.

— Найлепшае правядзеньне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

— Найлепшая арганізацыя ўсесаюзнага збору рабочых прапаноў і вынаходніцтваў і ў асаблівасьці рэалізацыі іх.

Найлепшая перабудова па-новаму работы вытворчых нарад і ўцягненьня ў іх найшырэйшых рабочых мас.

— Найлепшае правядзеньне калдагаворнай кампаніі.

— Найлепшая арганізацыя сталовак пры прадпрыемствах.

Усе гэтыя палажэньні, паводле нашай думкі, павінны зьявіцца асноўнымі патрабаваньнямі для акрэсьленьня, у выніку конкурсу, лепшых перадавых прадпрыемстваў, якія заслугоўваюць усесаюзных прызоў.

Конкурс гэты, натуральна, павінен уключыць у сябе такія кампаніі, як збор рабочых прапаноў, арганізацыя сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Для заахвочваньня прадпрыемстваў, якія адзначыліся ў конкурсе, мы прапануем устанавіць наступныя ганаровыя прызы: а) пераходныя сьцягі «Правды», «Камінтэрну», УсеЦСПС, ЦК УсеЛКСМ і УсеЦВК, б) сьцягі МК і ленінградзкага абкому, в) сьцягі буйнейшых рэспубліканскіх краёвых і абласных партарганізацый, г) сьцягі брацкіх кампартый і Далёка-Усходняй Чырвонай арміі. Мы цьвёрда ўпэўнены, што пад гэтымі сьцягамі ў барацьбе за пяцігодку, заводзкія калектывы дабіюцца новых рашаючых перамог. Рабочыя масы сапраўды па-баявому будуць біцца за аўладаньне гэтымі ганаровымі прызамі.

Перадавікі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва — лепшыя арганізатары і лепшыя рабочыя з вытворчасьці павінны быць прадстаўлены «Правдой» і УсеЦСПС у УсеЦВК для масавай узнагароды ордэнамі Чырвонага Працоўнага Сьцягу.

Лепшыя прадпрыемствы (у асаблівасьці тыя, што атрымалі сьцягі) павінны дадаткова атрымаць грашовыя прызы на пабудову фабрык-кухань, сталовак, лазьняў, пральняў, ясьляй, дамоў камун для лепшых ударнікаў, рабочых з вытворчасьці і арганізатараў сацыялістычнага спаборніцтва. Праз арганізацыю гэтых бытавых устаноў мы дабіемся ўцягненьня ў гэты конкурс ня толькі рабочых і работніц, але і жонак рабочых, якія крэўна зацікаўлены ў тым, каб на прадпрыемствах была разгорнута добрая сетка бытавых устаноў.

Мы чыталі ў «Правде» аб тым, што УсеЦСПС і ВСНГ вызначаюць 50 млн. руб. у фонд прэміяваньня за вынікі другога гаспадарчага году. Таму, частку гэтага фонду (прыкладна 1/3) мы прапануем вызначыць для заахвочваньня прадпрыемстваў, цэхаў і ўдарнікаў за вынікі выкананьня **другога году пяцігодкі.** А дзьве трэці гэтай сумы ўнесьці ў фонд прэміяваньня на конкурсе **трэцяга году пяцігодкі.**

Апроч таго, мы лічым, што неабходна неадкладна ўсім арганізацыям і ў першую чаргу друку **разгарнуць падрыхтоўку кампаніі да пачатку новага гаспадарчага году.** Трэці год зьявіцца рашаючым годам пасьпяховага ажыцьцяўленьня пяцігодкі і таму **30-га верасьня** павінна быць абвешчана **днём усесаюзнай гатоўнасьці, днём урачыстасьці працы.**

У гэты дзень на ўсіх прадпрыемствах Савецкага Саюзу павінны быць пастаўлены даклады **пра вынікі другога году, аб прапрацоўцы кантрольных лічбаў трэцяга году пяцігодкі і аб вызначэньні сустрэчных прамфінпляну зьнізу.**

Работа клюбаў, тэатраў, кіно, эстрады павінна быць у гэтыя дні **цалкам падпарадкавана сустрэчы новага гаспадарчага году.** Да гэтага дня трэба таксама прыстасаваць выдачу першых прызоў лепшым прадпрыемствам і ўдарнікам за паказальныя вытворчыя вынікі другога году пяцігодкі.

**Сустрэча новага гаспадарчага году** павінна папярэджваць аб пачатку вытворчага конкурсу і такім чынам падрыхтаваць рабочыя масы да ўдзелу ў ім.

У склад журы гэтага конкурсу, якое праз паўгода вызначыць прызы прадпрыемствам, мы прапануем уключыць прадстаўнікоў усіх буйнейшых гаспадарчых і грамадзкіх арганізацый і установу: «Правды», УсеЦСПС, «МОСПС» і ЛАСПС, ВСНГ, ЦК УсеЛКСМ, Наркамправы, ЦК рабочых саюзаў, прадстаўнікоў цэнтральнага і вобласнага друку, прамысловых цэнтраў, лепшых ударнікаў маскоўскіх і ленінградзкіх прадпрыемстваў. Гэта аўтарытэтнае журы вызначыць, хто варты мець за першае паўгода ганаровыя прызы-сьцягі—«Правды», Камінтэрну, УсеЦСПС і інш. арганізацый.

Мы выказваем цьвёрдую надзею, што наша ідэя сустрэчы новага гаспадарчага году і конкурсу лепшых прадпрыемстваў **знойдзе гарачы водгук з боку ўсяго пралетарыяту Савецкага Саюзу.** Просім нашу «Правду» шырока адкрыць свае старонкі для арганізацыі правядзеньня гэтых мерапрыемстваў. Просім увесь савецкі друк падтрымаць нашу прапанову.

Конкурс дапаможа рабочай клясе максымальна разьвіць і выканаць прамфінплян трэцяга году пяцігодкі, падтхніць новым уздымам масы, узьніме ўмоўна, апраўдае сябе і з палітычнага і з практычнага боку. **Разгорнуты на аснове мабілізацый найшырэйшых мас, ён зьявіцца рашаючым зьяваном для эпохі сацыялістычнага будаўніцтва.**

Няхай жыве ленінскі ЦК і яго генэральны сакратар, правадыр партыі тав. **Сталін!** Няхай жывуць пастановы XVI партыйнага зьезду — **найвялікшыя вехі ленінскага шляху.**

## Падтрымаем пачын ленінградзкіх рабочых

Пачын рабочых ленінградзкага заводу імя Сталіна павінен знайсьці шырокі водгук сярод пралетараў БССР. Беларускія фабрыкі і заводы, калгасы і саўгасы ўключацца ва ўсесаюзны конкурс лепшых прадпрыемстваў.

Ліквідаваць прарывы, выканаць пляны другога году пяцігодкі, выканаць дырэктывы XVI-га партзьезду, выявіць усе скрытыя рэсурсы, на аснове „сустрэчнага прамфінпляну гаспадарчага „скласьці максымальныя кантрольныя лічбы для новага гаспадарчага году, забясьпечыць іх выкананьне,—вось задача прадпрыемстваў, якія ўдзельнічаюць у конкурсе.

Конкурс лепшых прадпрыемстваў—гэта вялікая палітычная кампанія падрыхтоўкі да сустрэчы прадапошняга году пляну вялікіх работ. Гэта—заклік да мабілізацыі сіл і энэргіі рабочае клясы. Гэта—агляд яе гатоўнасьці да новых перамог, новых посьпехаў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

**КП(б)Б** побач з маскоўскай, ленінградзкай і іншымі арганізацыямі ўключыць у лік ганаровых прызоў **свой чырвоны сьцяг.** ВСНГ, ЦСПСБ, прафсаюзы, гаспадарчыя арганізацыі вылучаць спэцыяльныя фонды прэміяваньня лепшых з лепшых.

Друк узьніме шырокую кампанію папулярызацыі конкурсу.

Брыгады, цэхі, заводы—на спаборніцтва на лепшую сустрэчу трэцяга году пяцігодкі, на змаганьне за сьцяг КП(б)Б! Пралетары БССР павінны заняць і займуць ганаровае месца сярод лепшых з лепшых!

**ВАСІЛЕВІЧ.**

ЗАКРОЙНЫ ЦЭХ швэйнай фабрыкі «КАСТРЫЧНІК», на якой «сустрэчным прамфінплянам» перавышаны кантрольныя лічбы

## ЦСПСБ уключае свой сьцяг

У гутарцы з нашым супрацоўнікам адказны сакратар ЦСПСБ т. АВЕРЫН, у сувязі з адозвай рабочых заводу імя Сталіна, заявіў наступнае:

— Заклік рабочых заводу імя Сталіна, бязумоўна, знойдзе шырокі водгук з боку рабочых Савецкай Беларусі, рабочых саўгасаў і шырокіх мас калгаснікаў.

Апошнія дні другога году пяцігодкі, рабочай клясай павінны быць скарыстаны для напружанай работы па выкананьні прамфінпляну, па ліквідацыі прарываў, якія мелі месца на некаторых заводаў і фабрыках. Вытворчыя нарады, заўкомы і фабкомы, трохкутнікі, забясьпечыўшы 100-процантнае уцягненьне рабочых у прапрацоўку «сустрэчных прамфінпляну» на 1930-31 гаспадарчы год, павінны будуць улічыць усе магчымасьці, ЯКІЯ НЯ БЫЛІ СКАРЫСТАНЫ ПРЫ ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНАЎ БЯГУЧАГА ГАСПАДАРЧАГА ГОДУ. Таксама трэба забясьпечыць уважлівыя адносіны і глыбокую прапрацоўку прапаноў, якія ўносяцца рабочымі, ударнымі брыгадамі і вытворчымі нарадамі. ГЭТА БУДЗЕ ЛЕПШАЙ ГАРАНТЫЯЙ ПАСЬПЯХОВАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ У ТРЭЦІМ ГОДЗЕ ПЯЦІГОДКІ.

Конкурс на лепшы завод, фабрыку саўгас і калгас — вялізарнае палітычна мерапрыемства па мабілізацыі рабочае клясы на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, па выкананьні пастаноў XII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б), па індустрыялізацыі краю.

Прафсаюзы БССР пад цьвёрдым, выпрабаваным кіраўніцтвам КП(б)Б, АПІРАЮЧЫСЯ НА МАГУТНЫ ЎЗДЫМ ЭНТУЗІЯЗМУ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ, здолеюць выканаць пастаўленыя партыяй задачы.

ЦСПСБ, побач з маскоўскімі і ленінградзкімі прафарганізацыямі, УКЛЮЧАЕ СВОЙ ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ ДЛЯ ЎЗНАГАРОДЫ ЛЕПШАГА З ЛЕПШЫХ ЗАВОДАЎ.

Фабрыкі, заводы, калгасы і саўгасы якія ўключаюцца ва ўсесаюзны конкурс павінны змагацца за ганаровае першынства.

## Варштат абганяе трэст

### БЕЛШЧАЦІНА НЯ ЎЛІЧЫЛА МАГЧЫМАСЬЦЯЙ ШЧОТАЧНАЙ Ф-КІ

### КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ НЕ ДАВЕДЗЕНЫ ДА ЦЭХАЎ

### Струменем прапаноў рабочыя выпрауляюць памылкі кіраўніцтва

Падрыхтоўка да складаньня «сустрэчнага прамфінпляну» на менскай шчотачнай фабрыцы імя Крупскай толькі пачалася. На пасяджэньні фабкому, на якім прысутнічала каля 80 рабочых, намесьнік дырэктара тав. **Хэйман** азнаёміў з кантрольнымі лічбамі. Гэтыя кантрольныя лічбы выпрацаваны самой адміністрацыяй фабрыкі, бо лічбы Белшчаціны былі **паменшаны супроць фактычных магчымасьцяй.** Праграма была павялічана адміністрацыяй фабрыкі на 300.000 руб., параўнальна з бягучым годам—на 37 проц. Гэта патрабуе ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы на 18 проц., пры зьніжэньні сабекошту на 7 проц. Значнае палягчэньне ў выкананьні гэтай праграмы ўносіць **стандартызацыя,** на якую пераходзіць шчотачная фабрыка: замест 25 гатункаў шчотак, будзе вырабляцца толькі 14 гатункаў.

У спрэчках на пасяджэньні фабкому выступіла 15 рабочых.

Тав. **Чарнецкі** паказаў на тое, што рабочыя працуюць ня поўны рабочы дзень. Падача матар'ялу так дрэнна арганізавана, што кваліфікаваным рабочым прыходзіцца самім шукаць матар'ялаў. Для цыркуляркі падаюць такі сырэц, які на 75 проц. складае брак. **Адміністрацыя аб гэтым ведае, але ніякіх мер ня прымае.**

Работніца **Сухарэнка** кажа, што ў апрацоўчым цэху прадукцыйнасьць працы зьнізілася на 50 проц. таму, што палітура для фарбы дрэннай якасьці. Калі аб гэтым заявілі майстру цэха тав. **Крэйндэлю,** ён адказаў —«вы лянуецеся працаваць», ня прыняўшы мер для паляпшэньня фарбы.

Работніца **Рогава** дадае, што цэх апрацоўчы завалены рознымі непатрэбнымі матар'ялам, няма дзе павярнуцца, не хапае скрынак для падачы шчотак, для чысьцільных варштатаў не хапае кругоў.

Ня лепш у такарным цэху. Рабочы **Скаржынскі** заяўляе, што токары замест таго, каб стаяць ля варштатаў, прымушаны прыносіць матар'ялы для абточкі са двара. Адміністрацыя шкадуе паставіць асобнага рабочага. У зьвязку з гэтым прадукцыйнасьць працы ў такарным цэху зьнізілася на 70 проц.

— А вы думаеце, што ў наборным цэху лепш? — пытае работніца **Сасонкіна.** — І там кожны дзень прастой з-за ненармальнай падачы матар'ялаў. Калі аб гэтым заявілі майстру **Дыкштэйну,** ён адказаў — «Гэта ня важна». Машыны ў гэтым цэху выпускаюць дрэнную прадукцыю і ніхто на гэта не зварачае ўвагі.

Ня гледзячы на ўсе гэтыя недахопы, фабрыка за 9 месяцаў выканала праграму **на 102 проц.** Гэта значыць, што, **ліквідаваўшы недахопы, фабрыка здолее значна перавыканаць сваю праграму.**

Апрача вытворчых непаладак, ёсьць шмат недахопаў у кіраўніцтве грамадзкім жыцьцём фабрыкі. Партыйная і камсамольская ячэйкі амаль ня цікавяцца спаборніцтвам і ўдарніцтвам. Яны яшчэ ня поўнасьцю павярнуліся тварам да вытворчасьці, не рэагуюць на дрэнныя паводзіны асобных членаў партыі і камсамольцаў. Камсамолец **Левін** выпускае дрэнную прадукцыю, ня выконвае загадаў майстра, у часе працы лаецца з ім. **З 165 камсамольцаў толькі 60 лічацца ва ўдарных брыгадах.** На камсамольскіх сходах вельмі рэдка абмяркоўваюцца вытворчыя пытаньні. Выхаваўчая работа сярод моладзі не вядзецца.

Прагулы не памяншаюцца. Гуляюць па 2-3 дні. Работніца **Тарасенкава** прагуляла тры дні і ніхто на гэта не завастрыў увагі рабочых.

Ліквідацыя вытворчых недахопаў, узмацненьне працдысцыпліны, ажыўленьне сацспаборніцтва і ўдарніцтва дапамогуць фабрыцы выпрацаваць «сустрэчны прамфінплян» **са значнымі паказальнікамі.**

Разгортваньню арганізацыі «сустрэчнага прамфінпляну» перашкаджае **адсутнасьць кантрольных лічбаў па асобных цэхах.** Адміністрацыя абяцала давесьці кантрольныя лічбы да цэхаў у бліжэйшыя дні. Але да гэтага часу свайго абяцаньня ня выканала.

Рабочыя і работніцы, **не чакаючы кантрольных лічбаў,** самі ўзяліся за складаньне «сустрэчнага прамфінпляну». На ініцыятыве работніцы **Сасонкінай, 56 работніц, якія вырабляюць шчоткі № 25, павялічылі кантрольную лічбу адміністрацыі з 1.300 шчотак у дзень да 1.412 шчотак.**

**Пачаўся збор прапаноў.** На жаль, дакладнага ўліку прапаноў няма, але сярод іх ёсьць такія, што прыносяць фабрыцы шмат эканоміі. **Рабочы Славін прапанаваў мэханізаваць рэзку ручак для пэндзэляў. Гэта ўзьніме прадукцыйнасьць працы на 150 проц. Рабочы Крэйндэль прапанаваў новы спосаб варкі клею, які дасьць эканоміі 5.000 руб. у год. Мэханік Міклашэўскі, вынайшоў машыну для акругленьня канцоў ручак. Машына павышае прадукцыйнасьць працы на 400 проц. Майстар Дыкштэйн вынайшоў машыну для ўціркі дроту і клейкі фанэры. Эканомія — 15.000 руб. у год. Рабочы Оксэнкруг удасканаліў варштат для ачысткі ручак і вырабу пэндзэляў, што дае павялічэньне прадукцыйнасьці працы на 180 проц.**

Гэтыя прапановы перакапалі фабрычныя арганізацыі ў тым, што, **толькі разгортваючы ініцыятыву рабочых,** можна будзе дабіцца вялікіх посьпехаў у падрыхтоўцы да трэцяга году пяцігодкі. **Зараз адміністрацыя вызначыла 1.000 руб. для прэміяваньня рабочых за лепшыя прапановы.** Фабрычныя арганізацыі павінны яшчэ больш мабілізаваць увагу рабочых вакол «сустрэчнага прамфінпляну».

**М. ЦЫРЛІН.**

## Фабрыка імя Лекерта—у хвасьце

15-га жніўня на тэхнічнай вытворчай нарадзе віцебскай абутковай фабрыкі імя Лекерта абмяркоўваўся ход прапрацоўкі кантрольных лічбаў на 1930-31 год. Выявілася, што да гэтага часу вакол гэтага пытаньня ня была мабілізавана рабочая маса. На цэхавых сходах абгаворэньне кантрольных лічбаў праходзіць зусім слаба. Замест 450—500 чал. на зьменавых сходах прысутнічае толькі 100—120 чал.

На асобных групах рабочых кантрольныя лічбы не абгаворваюцца. Фабком, парткалектыў і цэхавыя партячэйкі мала гэтым пытаньнем займаюцца. Ня было склікана ні аднаго цэхавага партыйнага сходу. Камсамольскі калектыў таксама пляцецца ў хвасьце.

Пытаньні аб прэміяваньні рабочых за лепшую прапанову да апошніх не даведзена. Рабочыя ня ведаюць ні аб кольскасьці сродкаў фонду прэміяваньня, ні аб карэдку прэміяваньня.

**М. Скараходаў.**

## „Рацыяналізацыя—не мяркуецца"

Лесбел з кантрольнымі лічбамі спазьніўся на месяц. Другі этап — складаньне прамфінпляну — яшчэ не пачынаўся. Ніякай падрыхтоўчай работы не вядзецца. У плянавым аддзеле Лесбелу—поўны спакой. Апошні тэрмін прадстаўленьня прамфінпляну заводамі — 1-е верасьня, а трэст аб гэтым не клапоціцца.

Аб «сустрэчным прамфінпляне» ніхто нават не гаворыць. Ня гледзячы на тое, што а боку ВСНГ былі прапановы аб арганізацыі тэхнічнай дапамогі заводам у прапрацоўцы кантрольных лічбаў, Лесбел нічога ня робіць.

Тое, як рыхтуюцца заводы, відаць з адказу дырэктара лесазаводу «Адраджэньне» (ў Хойніках) — **т. Дзінава** — на пытаньне аб пляне рацыяналізацыі.

— «Рацыяналізатарскія мерапрыемствы паводле пляну на 1930-31 год, — піша дырэктар Дзінаў, — на нашым заводзе не мяркуюцца». Гэты адказ —выразна адлюстроўвае кіраўніцтва Лесбелу.

**Рог.**

ФАСОНІРОВАЧНЫ ЦЭХ галаштавай фабрыкі «БЕЛАРУСКА», на якой добра ідзе складаньне «сустрэчнага прамфінпляну»

## За сьцяг УсеЦСПС

### Абутнікі, бярэце прыклад са швэйнікаў

На Менскай швэйнай фабрыцы «Кастрычнік» адчуваецца вялікае змаганьне за атрыманьне пераходнага сьцягу УсеЦСПС. Вытворчая праграма перавыкананa. Таксама перавыканана заданьне па зьніжэньні сабекошту: замест 12,7 проц. сабекошт зьнижан на 14,8 проц., прадукцыйнасьць працы ўзьнята на 46 проц. замест 42 паводле пляну. У жніўні фабрыка таксама працуе добра, перавыкананўшы праграму за 24 дні на 1,22 проц.

Зараз на фабрыцы ідзе вялікая работа па прапрацоўцы кантрольных лічбаў. Пасьпяхова складаецца «сустрэчны прамфінплян», уносяцца каштоўныя прапановы.

**Рабочыя фабрыкі «Кастрычнік» ведаюць умовы конкурсу на атрыманьне сьцягу УсеЦСПС і ўпарта б'юцца за перамогу.**

Зусім інакш абстаіць справа на менскай абутковай фабрыцы. Паводле заявы сакратара парт'ячэйкі **тав. Фэльдмана,** на фабрыцы **нічога ня робіцца для папулярызацыі конкурсу на лепшае прадпрыемства і рабочыя ў цэхах з гэтым пытаньнем не знаёмы.**

Абутнікі павінны ўзяць прыклад са швэйнікаў.

**Ц.**

## ДА ВЕДАМА МОПР-АКТЫВУ.

**У пятніцу, 29 жніўня, адбудзецца**

## АГУЛЬНЫ СХОД МОПРАЎСКАГА АКТЫВУ ГОРАДУ.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Чарговыя задачы МОПР'у—даклядчык т. КАЛМЫК.
2. Што кажуць аб павільёне МОПР'у на выстаўцы (пытаньне цікавых запісаў экскурсантаў).

Пачатак сходу роўна а 7 гадз. веч. у памяшк. ЦК МОПР'у (Савет., 87).

Яўка ўсіх членаў бюро ячэек МОПР'у, членаў райкомаў і б. акруткому МОПР'у абавязкова.

**ЦК МОПР БССР.**




Павільён ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫІ ноччу

## Эканомце электра-энэргію!

Прамысловыя цэнтры СССР — Масква і Ленінград — перажываюць зараз крызіс у забесьпячэньні электра-энэргіяй. Ня гледзячы на пуск магутных электра-станцый (Валхаўбуд, Шатура, «Чырвоны Кастрычнік» і інш.) энэргетычная база для індустрыялізацыі краіны пакуль што яшчэ недастаткова. Неабходна прыняць тэрміновыя меры для ўнікненьня крызісу ў забесьпячэньні электра-энэргіяй.

Г. Менск забясьпечваецца і будзе. у працягу бліжэйшых 2-3 год, забясьпечвацца электра-энэргіяй ад станцыі Эльводу, якая пашыраецца ў даны момант устаноўкай новага турба-генэратару ў 3.750 квт. Новы турба-генэратар будзе пушчаны ў лістападзе месяцы, а да таго часу станцыя ня ў моцы задаволіць усіх патрэб гораду. У сувязі з наступіўшым сэзонам асьвятленьня і ўключэньнем выстаўкі, Эльвод працуе з перагрузкай у вячэрнія гадзіны. Нагрузка ўсё павялічваецца і неабходна яе зьнізіць. Для гэтага трэба ў тэрміновым парадку прыступіць да выкананьня дырэктывы ўраду і партыі аб эканомным і беражлівым выдатканьні электра-энэргіі, стварыць безадкладна на прадпрыемствах і ўстановах брыгады па барацьбе за эканомнае выдаткаваньне электра-энэргіі.

Эльвод прадстаўляе тэхнічныя сілы для наладжканьня спэцыяльных налётаў на прадпрыемствы, установы і прыватныя кватэры. Вылучаным брыгадам неабходна гэта пытаньне паставіць на шырокае абмеркаваньне ў цэхах, каб давесьці яго да кожнай брыгады і варштату.

Толькі пры агульных намаганьнях рабочых мас Эльвод можа атрымаць зьніжэньне нагрузкі на некалькі сот квт. і безхваравіта падысьці да ўключэньня новай турбіны. Грамадзкім арганізацыям Эльводу трэба стварыць штаб па барацьбе з драпежніцкім і немэтазгодным перавыдаткаваньнем электра-энэргіі ў горадзе і хутка выяжджаць на месцы для складаньня актаў і прыцягненьня віноўных да адказнасьці. Адміністрацыяй Эльводу ўзабуджана хадайніцтва перад Гарсаветам аб прадастаўленьні права, на складзеных брыгадамі актах, безадкладна выключаць электра-энэргію.

**Дырэктар Эльводу ВІКТАРАЎ.**
**Старшыня заўкому ЕГМІЛАЎ.**
**Галоўны інжынэр ДОБКІН.**

## „Зьвязда" дапамагла

**ВЫМОВА ЗА НЯЎВАЖЛІВЫЯ АДНОСІНЫ ДА ЗАГАТОВАК**

Селькор паведаміў нам, што **Багушэўскі** Райжывёлсаюз няўважліва адносіцца да загатоўкі бульбы. Былі выпадкі, што загатоўленая бульба ляжала па 3-4 дні каля складаў нічым не накрытая. Апроч гэтага, у гэтым-жа Райжывёлсаюзе наглядалася нядбайнасьць да захаваньня загатоўленага сена. Былі і іншыя недарэчнасьці, як напрыклад, сельска-гаспадарчыя машыны валяліся на вуліцы і т.д.

Факты гэтыя расьсьледваньнем падцьвердзіліся. **Аршанская Акр. РСІ** за нераагаваньне на гэтыя недахопы старшыні **Багушэўскага Раймалжывёлсаюзу — т. Лігіраву абвясьціла вымову.**

**САЎГАС БУДЗЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ ЛЕСАМАТАР'ЯЛАМ**

Будаўніцтва ў саўгасе імя **«10-ці годзьдзя БССР»** знаходзіцца пад пагрозай зрыву з тае прычыны, што саўгас не забясьпечаны лесаматар'яламі і рабочай сілай. Пра гэта пісаў нам наш селькор. Згодна паведамленьня **Белкалгасбуду**—зараз ужыты захады да фарсаванай падвозкі лесаматар'ялаў на месца пабудовы, а таксама камандыраваны ўпаўнаважаны Белкалгасбуду па вярбоўцы патрэбнай колькасьці рабочай сілы.

* * *

Т. С. у адным з сваіх артыкулаў пісаў, што калгас **Рэкцянскага** с.-с., **Горацкага** раёну, засьмечаны чужымі элемэнтамі. Так, напрыклад, у калгасе маюцца прысуджаныя да прымусовых работ — **Бондараў Ц., Стаўбаноў І., Бліндзіраў В., Карнагай**—за разбазараваньне маемасьці пры ўступленьні ў калгас. Расьсьледваньнем гэтыя факты падцьвердзіліся. Праўленьне калгасу пераабрана, а таксама чужыя элементы выключаны з калгасу.

*З Усебеларускай выстаўкі*

# АДЗІНЫ Ў САЮЗЕ

(На заводзе-камбінаце па тэхнічнай пераапрацоўцы садавіны)

Крыху ў баку ад рэшты павільёнаў, за плянтацыямі кветак, узьняўся завод па тэхнічнай пераапрацоўцы садавіны.

Завод, як завод. Як усе будынкі на тэрыторыі выстаўкі—лёгкі, з эканомнаю плошчаю, пабудаваны ў сьветлых і бадзёрых тонах.

Але ў ім ёсьць маленькія асаблівасьці, якія ўсё-ж такі адрозьніваюць яго ад іншых пабудоў. Напрыклад—тое, што завод-камбінат такога тыпу—адзіны ў Саюзе. Што энтузіязм яго кіраўнікоў—піянэраў сваёй справы—яшчэ не падхоплены нашымі арганізацыямі. Што ён дасканала ўтылізуе і такі прадукт, ніжэй якога па якасьці наўрад ці знойдзеш.

Штодня на заводзе бывае звыш 600 арганізаваных наведвальнікаў, пераважна калгасьнікаў. Чым жа абумоўлены гэткі прыбой?

На заводзе тры цэхі. У адным адціскаюцца і сартуюцца пладовыя сокі, у другім вырабляюцца жале, мармалад, сыропы, канфітуры, у трэцім—віны.

Апад розных гатункаў, самая нягодная садавіна тут ператвараецца без награвання ў безалкагольныя натуральныя сокі, з захаваньнем вітамінаў і ўсіх спажыўных каштоўнасьцей. Тут літаральна «з нічога» атрымліваецца жэле (якое заменяе тлушчы і цукар); з адкідаў пры вырабе жэле і сушцы—нямецкі мармалад (накшталт павідла).

Нарэшце, мы маем, праўда, у нязначнай частцы, выраб пладова-алкагольных він (моцнасьцю да 14 градусаў) і сыропаў.

Для кандытарскай вытворчасьці БССР, а галоўным чынам для экспарту, на заводзе вырабляецца паўфабрыкат—яблычнае цеста.

Экскурсанты гаворацъ:

— Мы дагэтуль ня верылі, нават, што можна з падалак мець такія добрыя прадукты...

Пабудова гэтага заводу каштавала ўсяго 52 тысячы рублёў. У той-жа час ён мае значную прапускную здольнасьць. Так, у дзень завод дае 1 тону мармаладу, 2,5 цэнтнэры жэле, бутэлек 300 сыропу, 7 тон яблычнага цеста і 800 бутэлек безалкагольных сокаў, ня лічачы він і сушаных прадуктаў.

Характэрнай асаблівасьцю гэтага заводу зьяўляецца максымальная нагрузка машын. Адныя і тымі-ж машынамі абслугоўваюцца розныя галіны вытворчасьці. Напрыклад, з сыропамі, з сокамі, з жэле пасьпяхова спраўляецца адна машына. Але наогул ў абсталяваньні заводу адчуваюцца перабої. Побач з удасканаленымі сапраўды паводле апошняга слова тэхнікі фільтрамі для зьнішчэньня мікра-арганізмаў, фірмы «Зейц», ужываюцца старажытныя катлы з драўлянымі мяшалкамі.

Да рэчы: шмат замежных машын гэтае вытворчасьці можна было-б вырабіць на нашых савецкіх заводах. Мы дагэтуль проста не зьвярталі належнае ўвагі на тэхнічную пераапрацоўку фруктаў і ягад.

Завод зараз не нагружаны поўнасьцю. На ім працуюць дзьве зьмены рабочых. Сырэц ёсьць (яго дастаўляюць прыгарадныя калгасы, а таксама гаспадаркі Астрашыцка - Гарадзецкага раёну), але пакуль што бракуе рабочае сілы. Хутка завод пяройдзе на 3-зьменную работу.

Калі будавалі завод—мелі на ўвазе толькі паказаць працэс вытворчасьці. Потым вывялася, што ёсьць сэнс (і вялікі сэнс) пакінуць завод надалей. І Наркамзем разам з Выстаўкомам, вырашылі: завод будзе працаваць і пасьля закрыцьця выстаўкі.

Але вельмі цяжка з забесьпячэньнем заводу цукрам. Бяз цукру ён будзе прымушаны абмежавацца загатоўкаю яблычнага цеста. Гэта недастаткова. Трэба ўсямерна падтрымать цікавую і каштоўную, пры нашых часовых гаспадарчых цяжкасьцях, вытворчасьць.

Слова за Наркамгандлем.

**Леванід Свой.**

## ЭТНАГРАФІЧНЫ МУЗЭЙ ПРЫ БАН

У новым будынку Беларускай Акадэміі Навук будзе адведзена спэцыяльнае памяшканьне для этнаграфічнага музэю. Катэдра этнаграфіі ўжо распачала падбор экспанатаў для будучага музэю.

Рад экспанатаў ужо набыты ў часе сёлетніх экспэдыцый. Складзена багатая фота-картачка па матар'яльнай культуры і г. д.

Музэй будзе будаваць свае аддзелы па вытворчым прынцыпе. У ім будуць паказаны ўсе галіны гаспадарчага жыцьця нацыянальнасьцяй БССР—зямляроблства, будаўніцтва, жывёлаводзтва, пчалярства, паляўніцтва, рыбалоўства і інш. ад самых прымітыўных форм да форм вышэйшых—сацыялістычнае гаспадаркі. Разам з вытворчымі працэсамі будзе паказаны культ. які суправаджаў калісьці гэтыя працэсы.

Этнаграфічны музэй, цэнтр этнаграфічных досьледаў, павінен зьявіцца таксама паўцая культурнай і выхаваўчай школай для працоўных.

**Р. С.**



Экстрактар для крухмальных заводаў вырабу заводу «Энэргія», паказаны на с.-г. выстаўцы

## ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

**КК ЦК ЛКСМБ** паведамляе, што 29 жніўня, а 6 гадз. увечары адбудзецца пасяджэньне ЦКК, на якім будуць разгледжаны справы: т. т. **Туніка С., Гольдзіна Ш., Шарлата Б., Розенгауза М., Сонца В., Дорскага А., Барканава А., Белаусава Я., Серафімовіча М.; Воранава А.** (Менск), **Понер М., Понер К., Лебедзева М., Кольчава В., Вальфсона Ф.** (Магілеў), **Ольдэнбэргера Г., Войтава М., Старынскага В.** (Віцебск), **Арцімовіча М., Всраб'я М.** (Мазыр), **Казлова П., Дзянісава В.** (Ворша), **Шаркевіча І. і Вераценка А.** (Полацак).

На пасяджэньне выклікаюцца ўсе таварышы, справы якіх будуць разглядацца, а таксама сакратары ячэек, якія зараз знаходзяцца ў Менску. Праезд за свой кошт.

**КК ЦК ЛКСМБ.**

**Клюб Саўгандальслужачых.** 1 верасьня, а 7 гадз. ўвечары культсэктар ЦСПСБ склікае нараду па пытаньні аб становішчы і задачах малых форм мастацтва ў рабочых клюбах. На нараду павінны зьявіцца загадчыкі клюбаў, кіраўнікі мастацкіх гурткоў, усе гурткоўцы, клюбны і фабзаўмясцкомаўскі культактыў. Запрашаюцца рабочыя

**Дом Асьветы.** Сёньня, а 6½ гадз. увечары адбудзецца агульны сход камсамольскага калектыву працасьветы. Яўка абавязкова.

Сёньня, а 5 гадз. дня ў памяшканьні **ЦП саюзу працасьветы** склікаецца **пасяджэньне палітасьветнага сэктару ЦП саюзу.** Запрашаюцца ўсе кіраўнікі культасьветных груп ГК і МК саюзу Працасьветы, а таксама і добраахвотнікі палітасьветнага сэктару.

**МК БДУ** паведамляе, што дзень індустрыялізацыі працягнуты да 30 жніўня. Усе працаўнікі, якія яшчэ не працавалі ў карысьць дня індустрыялізацыі, павінны зьбірацца ў свой выхадны дзень да 30 жніўня, а 7 гадз. раніцы каля мясцкому БДУ для накіраваньня на работу.

**Сад Асьветы.** 27 жніўня—кіно «Паў і Паташон на моры». Пачатак а 9 г. 30 хвілін вечару. У выпадку дрэннага надвор'я кіно пераносіцца ў памяшканьне дому асьветы.

**БДУ.** Заняткі на другім і трэцім курсе падфаку пачнуцца 1 верасьня 1930 г. а 8 гадз. 15 хвілін раніцы.

**КАНЦЫЛЯРЫЯ ПЭДФАКУ**

28 жніўня, а 7 гадз. увечары ў прыродазнаўчым корпусе БДУ, аўдыторыя № 1, адбудзецца агульны адкрыты сход яч. КП(б)Б пэдфаку. У парадку дня:

1. Становішча камплектаваньня пэдфаку студэнтамі і навуковымі працаўнікамі на 1930-31 навучальны год; 2. Рознае. Запрашаюцца студэнты і навуковыя працаўнікі.

Ліквідацыйная камісія Менскага акругкому КП(б)Б прапануе ўсім камуністым, якія атрымалі пуцёўкі на выезд у раёны, базаскладна, не пазьней 27 жніўня г. г. абавязкова быць у раёне.

Усе камуністыя акруговых устаноў, якія не атрымалі пуцёўкі, павінны абавязкова зьявіцца ў ліквідком акругкому не пазьней 27 жніўня для накіраваньня ў раёны.

Справы тых, хто ня зьявіцца будуць перададзены ў ЦКК для прыцягненьня да адказнасьці ў партыйным парадку.

**Ліквідком Акругкому.**

**Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.**

28-га жніўня, а 8 гадзіне увечары, у клюбе саўгандальслужачых (пер Энгельса і Камуністычнай)

**ЦП саюзу саўгандальслужачых СКЛІКАЕ СХОД па пытаньні аб становішчы і пэрспэктывах забесьпячэньня рабочых гароднінай,** а таксама і абгаварэньне пытаньня **аб узьняцьці** актывістымі **Менскага Цэрабкопу на «грамадзкі буксір».**

На сход запрашаюцца: рабочыя абутковай фабрыкі, што шэфствуюць над МЦРК, прадстаўнікі РСІ, Наркамгандлю, НКЮ, БКС, брыгада з УсеЦСПС і Цэнтрасаюзу, прадстаўнікі вытворчых саюзаў, рабочыя - спажыўцы і ўвесь жаапактыў, а таксама прадстаўнікі рэдакцый газэт.

На сход абавязкова павінны зьявіцца ўсе супрацоўнікі МЦРК і ўвесь прафактыў саюзу СГС.

Папярэдні запіс у спрэчках і дачы канкрэтных прапаноў прымаюцца па тэлефону № 14-06 т. **Кацнельсонам.**

# МЕНСК

### Новы склад ЦП саюзу сувязі

24 жніўня скончыўся Усебеларускі зьезд працаўнікоў сувязі. У склад ЦП саюзу ўвайшло 15 чалавек. Старшынёй саюзу абраны былы старшыня аршанскага акрпрафсавету т. Кохан. Сакратаром — т. Жалязьнякоў.

### У вышэйшым савеце фізкультуры

З 28 жніўня адкрываюцца кароткатэрміновыя курсы пры ЦСПСБ па падрыхтоўцы кіраўнікоў фізкультурных гурткоў.

З 1 па 10 верасьня па Менску будуць праводзіцца фабрычна-заводзкія спартакіяды. У гэтых спартакіядах будуць прымаць удзел рабочыя—не фізкультурнікі разам з фізкультурнікамі. Спартакіяда мае мэтай ўцягненьне шырокіх пластоў рабочых у фізкультурныя гурткі.

З 10 па 15 верасьня адбудуцца гарадзкія міжсаюзныя спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы.

З 15 верасьня да 1 кастрычніка праводзіцца агульна-гарадзкі асеньні розыгрыш пяршынства па наступных спартыўных гульнях: футбол, баскетбол, валейбол і гарадкі.

### Фізкультура да МЮД'у

У дзень адкрыцьця ўрачыстага сьвяткаваньня МЮД'у фізкультурнае бюро ЦСПСБ арганізуе масавы прабег фізкультурнікаў да стадыёну.

7 верасьня на стадыёне і прафсаюзных спортпляцоўках будуць арганізаваны масавыя фізкультурныя практыкаваньні, прысьвечаныя міжнароднаму юнацкаму дню. Лепшыя фізкультурнікі з рабочых - батракоў і бядняцка-сераднякоўскае моладзі будуць пераданы ў КСМ. Сярод фізкультурнікаў будзе праводзіцца збор інтэрнацыянальных пятачкоў.

### За дзень

Трэці канцэнтр чыгуначнай 9-цігодкі ў Віцебску рэарганізуецца ў кінотэхнічную прафшколу.

У Доме Чырвонай арміі адкрываецца спэцыяльны аўта-габінэт.

— Менская гарбарня «Бальшавік» пераабсталёўваецца для вырабу хрому.

— Чырвонадубны цэх менскае гарбарні «Бальшавік» пераводзіцца ў Магілёў.

— 5 і 7 верасьня адбудуцца таварыскія сустрэчы паміж фізкультурнай камандай маскоўскага электра-заводу і камандай менскіх мэталістых.

— У гэтым годзе ў фізкультурны тэхнікум будзе прынята 90 чалавек.

### Ліст у рэдакцыю

**ПАВАЖАНЫ Т. РЭДАКТАР!**

У № 19 (2826) «Зьвязды» ад 22 студзеня 1928 г. быў зьмешчаны мой верш «Прыйдзе час».

У зборніку «Белорусской поэзии», які выданы Дзяржвыдавецтвам РСФСР у гэтым годзе зьявіўся гэты самы верш у перакладзе М. Рудэрмана, але не пад маім прозьвішчам, а пад прозьвішчам І. Плаўніка. Ня ведаю, чыя тут віна—Ізраіля Плаўніка, ці перакладчыка М. Рудэрмана; а можа і рэдакцыі зборніку, якая надзвычайна ўважліва аднеслася да выданьня зборніку.

Пра маё права на аўтарства хачу паведаміць шырокім колам чытачоў, якім прыдзецца сустрэць зборнік «Белорусской поэзии».

**С. Шушкевіч.**


БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
Чацьвер, 28 жніўня „Музыка масам".
АДЗІНЫ КАНЦЭРТ
заслужанага артыстага рэспублікі віртуоза гарманістага
Файзулы ТУІШАВА
Выконв. на 15-ці розных канструкцыі гармоніках. Пры ўдзеле саліста-піяністага Яўгенія ЛУКІНА.
Пачатак роўна а 9 г. веч. Падрабязнасьці ў афішах.
Папярэдні продаж білетаў у касе тэатру і ў рабочай касе.
Упоўнаважаны Натляроў.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
27, 29, 30, 31 жніўня, 1, 2 верасьня
„АВАНГАРД" п'еса ў 4-х дзеях. В. Катаеў.
Пастаноўка С. Разанава і К. Саньнікава. Мастак Ю. Гольц. Музыка В. Сакалова. Дырыжэр І. Гітгарц. Кіраўнік хору М. Кауфман. Паказ вядзе С. Калпашнікаў.
Пачатак роўна а 8 г. 30 м. Білеты прадаюцца ў касе тэатру у рабочай касе і на Усебеларускай выстаўцы.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА.
Вышлі з друку і паступілі ў продаж ва ўсіх кнігарнях БДВ і спажыўкаапэрацыі:
Бібліятэка работніцы і сялянкі.—
А. АБОРЫН.—МАЙСТАР І РАБОТНІЦА. Стар. 55. Цана 20 кап.
Для здатных рук.—
П. АЛБЫЧОЎ.—ГАДЗІНЬНІК. Стар. 60. Цана 15 кап.
БАРЫС ДОЛАЎ.—ПРЫКЛАДАМ І СПРАВАЙ. Стар 54. Цана 15 кап.

29-га жніўня, а 14 гадзіне, адбудзецца
ПРОБНАЯ РАДЫЁ-ПЕРАДАЧА
для раённых установак ПЛ2.
Просьба ўсім АЗ падрыхтавацца для прыёму.
БЕЛРАДЫЁЦЭНТР.

Кіно-тэатр „Культура"
Гэраічная аповесьць з гісторыі Чэчні
ЗЭЛІМ ХАН
у 6 частках.
Вытворчасьці «Усход-кіно»
Пачатак сэансаў: а 7 г., 9 г., 10 г. 30 м.
Каса—ад 5 гадз.

КІНО „Інтэрнацыянал"
Новая вясёлая камэдыя вытворчасьці «Саюзкіно»
Вялікая няпрыемнасьць
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз.
Каса—ад 5 гадз.

КІНО „Пралетары"
Мастацкі фільм
Начны крык
Драма ў 7 частках.
Пачатак 1 сэансу а 7 г.
Каса адчынена ад 5 г.

КІНО-САД
Ад АЎТОРКА, 26-га ЖНІЎНЯ
Вядомы комік Дуглас Мак-Лін
у лепшай замежнай камэдыі
ПАЗНАЁМЦЕ МЯНЕ
ў 7 частках.
— Толькі 2 сэансы. —
Пачатак 1-га сэансу а 9 г., 2-га—10 г. 30 м.
КАСА АДКРЫТА з 6 г.

Кіно СПАРТАК.
3 панядзелка, 25 жніўня.
Замежны выдатны фільм
ПАТАШ і ПЭРЛАМУТР
камэдыя ў 10 частках,
Пачатак сэансаў: 1 с.—7 г, 15 м., 2с.—9 г. 3 с.—10 г. 45 м.
КАСА—ад 6 гадз.

Мастацкі ЦЫРК | Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА
Серада 27 і чацьвер 28 жніўня
РЭКОРДНЫЯ ЦЫРКАВЫЯ ЗРЭЛІШЧЫ
ПРАЦЯГ ГАСТРОЛЯЙ
Музычных сатырыкаў 2 Конвальдзі | Юных акрабатаў 5 Росіні
Чалавек на мёртвым пункце Антоніо | Муштроўшчык Русель
Прымае ўдзел ўся трупа ў лепшых №№
— Пачатак а 8 г. 30 м. веч. —
Адказны кіраўнік І. Л. СТРАШЭВІЧ.
Канфэрансье Е. А. Яўгенаў.
АНОНС! ГЭТЫМІ ДНЯМІ ЛАНГО АНОНС!

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
Вышла з друку і паступіла ў продаж ва ўсіх кнігарнях БДВ і спажыўкаапэрацыі:
С. Серпаў.—ВЭТЭРЫНАРЫЯ БССР НА ВЫСТАЎЦЫ. Стар. 22, цана 10 кап.
П. П. Рагавы.—ГЛЕБЫ ТЭРЫТОРЫІ 1-ай УСЕБЕЛАРУСК. ВЫСТАЎКІ Стар. 28. цана 12 кап.
Аграном Ю. І. Шульман.—ПАРНІКІ І РАНЬНЯЯ ВЫГАНКА ГАРОДНІНЫ. Стар. 70, цана 15 кап.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
ВЫШЛА З ДРУКУ, ПАСТУПІЛА Ў ПРОДАЖ І РАССЫЛАЕЦЦА ПАДПІСЧЫКАМ
„ПОЛЫМЯ"
часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі, крытыкі
№ 7 за ліпень 1930 году № 7
ЗЬМЕСТ
Янка Колас.—Краіне Саветаў. Верш.
Цішка Гартны.—Пахучы зяб. Апавяданьне.
Андрэй Александровіч. Паэма імя вызваленьня. Паэма.
Кузьма Чорны.—Сямя Юрыя Гарэйкі. Навэля.
Міколай Хведаровіч.—Баявыя песьні. Вершы.
Л. Піонтэк.—Балаклава. Навэля. Перакл. з укр. мовы.
Алесь Звонак.—Трэцяя паэма.
Арнадзь Ласны.—Шлях пралетарскай перамогі. Нарыс.
Максім Лужанін.—Перамога. Верш.
Петрусь Броўка.—Песьня пра партфэль. Верш.
М. Канаплін.—Новы этап кансалідацыі фашызму і сацыял-фашызму.
М. Вісьлянскі.—Польшча ў ніскох эканамічнага крызісу.
О. Кананоцін.—За будаўніцтва сацыялізму.
Ляўкоў.—Барацьба за саветы ў беларускай вёсцы.
Хацкевіч.—З далёкага мінулага.
А. Некрашэвіч.—Заслона закрыта.
Кнігапіс.
Хроніка.
ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ДРУГУЮ ПАЛОВУ 1930 ГОДУ
Часопісь «Полымя» выходзіць штомесяц—(12 кніжак на год) памерам кожная 10-12 аркушаў. Падпісная цана на год 10 руб., на паўгода 5 руб.
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На 6 мес. 5 руб. | На 3 мес. 3 руб. | Кошт асобнага нумару 1 руб.
Падпісчыкі, якія ўнясуць пры падпісцы поўнасьцю 5 руб., атрымліваюць на працягу 1930 году дармова ілюстраваную часопісь «Чырвоная Беларусь».
НА ВЫПЛАТУ МОЖНА ПАДПІСАЦЦА Ў ДВА ТЭРМІНЫ: пры падпісцы—3 руб. і да 1 кастрычніка—2 рублі.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: У Бюро падпіскі «Кніга поштай» (Менск, Ленінская, 19, тел. 7-12); Беларускім Дзяржаўным Выдавецтвам (Менск, Савецкая, 63), Цэнтральнай Кнігарняй Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва (Менск, рог Ленінскай і Савецкай); усімі акруговымі аддзяленьнямі Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва, аддзелам падпіскі Беларускага аддзяленьня ГІЗ'а РСФСР (Менск, Савецкая, 54), яго агентурай па акругах і раёнах, усімі паштова-тэлеграфнымі канторамі і аддзяленьнямі, канторай газ. «Беларуская Бёска» (Менск, Савецкая, 63) ды не ўпаўнаважанымі і сельскоп.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты
лічыць несапраўднымі:
Дацрыз. кн., выд. Межанск. РВК, канд. карт. № 24575, выд. Віцебск. АК КП(б)Б, чл. біл. саюзу працасьветы Катановіча А. Я. 2138-2140
Чл. біл. саюзу чыгуначн. № 69046, асабов. пасьведч. № 38-к., камсам. біл. № 128273 Куцік Н. П. 2141-2143
Пэнс. кн. Цьвік С. І., выд. Мен. Мен. акрсабезам. 2144
Мэтр. вып Еўстратава А. Е., выд. ЗАГС'ам. 2145
Пасьведч. Майорава М. М., выд., пагранахранай. 2146
Чырвонаарм. пасьведч. Германа І. М., выд. аддз. эск. сувязі 7 д. 2147
Мэтр. вып. Лебедзевай Е. А., выд. Мен. ЗАГС'ам. 2148
Лек. кн. Шэра Б. І., выд. арт. краўцоў «Пралетары». 2149
Бірж. карт., выд. Мен. бірж. працы, мэтр. вып., выд. Харкаўск. ЗАГС'ам Рэдзіган Л. 2150-2151
Пасьведч. аб сканч. 2-х Мен. агульнаадукац. курсаў Рудэрман Ф. І. 2152
Канд. карт. № 22825, выд. Пухавіцк. РК КП(б)Б, чл. біл. саюзу працасьветы № 2232 Пэйсаховіч Ф. Г. 2153-2154
Парт біл. № 805357 Пятрыкевіча Р. І., выд. Мазырск. АК КП(б)Б. 2155
Пашп., выд. Запольск. с.-с., служ. кн., выд. 16 арт. п., пасьведч. з вязаў, акладныя лісты на 1929-30 г., выд. Заполльск. с.-с. на імя Фалевіча В. С. 2156-2159
Чл. біл. саюзу чыгуначн. Букеві Г. А. 2160
Мэтр. даведка Крэза М. А., выд. Мен. ЗАГС'ам. 2161
Канд. карт. Куніцкага В. П., выд. Мен. АК КП(б)Б № 27573. 2162
Чл. біл. саюзу горнарабоч. Мяшкова К. С. 2163
Вайск. біл. Плаўскага С. А., выд. Менскаматам. 2164
Парт. біл. № 0381179, выд. Гом. ка КП(б)Б, асабов. пасьведч., выд. Пазн. упр. РСЧА, асабов. пасьведч., выд. СНК БССР на імя Цытовіча В. Т. 2165-2166
Пэнс. кн. Вольскага А. І., выд. Мен. страхкасай. 2167
Чл. біл. саюзу працасьветы Галубовіча А. П. 2168
Лек. кн. Крывец М. М., выд. Мен. страхкасай. 2169
Чл. біл. Аўталору Шарніо Ф. І. 2170
Пашп. Друшчэнка С. Х., выд. Каскаковіцк. раймілісцыяй. 2171
Укладн. кн. Мысліўцэ Я. П., выд. Шацк. ашчадкасай. 2172
Вайск. біл. Дрыжупа Я. І., выд. Менскаматам. 2173

Вабруйскі
Індустрыяльна-Дрэваапрацоўчы Тэхнікум
паведамляе, што прыём залў на першы курс тэхнікуму працягнут да 15 га верасьня,
ЗАНЯТКІ ПАЧНУЦЦА 1-ГА КАСТРЫЧНІКА
Правілы прыёму ў тэхнікум, згодна правіл, зьмешчаных у даведніку ВКА на 1930/31 нав. год. Заявы падаваць на імя Тэхнікуму ў Бабруйскі Гарадзкі Інспэктарыят Нарасьветы.
Дырэктар Тэхнікуму Штыцко.

ЗАВОЧНЫЯ БУХГАЛЬТАРСКІЯ КУРСЫ
Прыём слухачоў праводзіцца круглы год.
Прымаюцца асобы з 17-гадовым узростам з асьветай ня ніжэй 5 гр. 7-годкі.
ПЛАТА ЗА КУРС 33 руб.
праводзіцца так: 9 руб. пры паступленьні на курсы, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8-ы месяц і па 4 руб. на працягу 6 месяцаў у пачатку кожнага навучальнага месяца
Заявы, запытаньні і [illegible]
Менск, пошта, скрынка 44, Завочным курсам.
На адказ прыкладаць 2 маркі па 10 кап.

ПАСЬПЯШАЙЦЕСЯ
падпісацца на газэту
„ЗЬВЯЗДА"
на ВЕРАСЕНЬ
і да канца году.
Падпісная плата на 1 мес.—90 кап., да канца году—3 руб. 50 кап.

У ВЫПАДКУ
НЕАКУРАТНАЙ
дастаўкі газэты
„ЗЬВЯЗДА"
званоце па тел.
2-49

50 к. кошт публікацыі аб згубе дакуманту

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ АСЬВЕТЫ БССР
склікае на 30 жніўня г. г. а 10 гадз. раніцы
ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ НАРАДУ
Бел. Дзярж. Унівэрсытэту і Пэдагагічных Інстытутаў
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Ход камплектаваньня і падрыхтоўка да новага навучальнага году (даклад рэктара БДУ і дырэктароў пэдінстытутаў).
2. Засесьлячэньне інтэрнатамі, навуч. плошчай, харчаваньнем і навуч. прыладамі (даклады рэктара БДУ і дырэктароў пэдінстытутаў).
3) Арганізацыя вытворчай практыкі студэнтаў (дакладчык дырэктар Віцебскага пэдінстытуту т. Калада).
4. Пераглядз навуч. пляну пэдфаку (дакладчык дэкан пэдфаку т. Усьпенскі).
5. Разгляд навуч. пляну фізыка-тэхн. аддз. Гомельскага пэдінстытуту.
6. Арганізацыя навукова-дасьледч. працы (дакладчык т. Мазур.
7. Аб становішчы завочнага пэдфаку і далейшыя пэрспэктывы па завочным навучаньні.
На нараду запрашаюцца: рэктар БДУ, дэканы Саўбуду-Наргасу і Пэдфаку, дырэктары Пэдінстытутаў у Гомелі, Віцебску, і Магілеве, прадстаўнікі сэктару кадраў ВСНГ, ЦСПСБ, саюзу працасьветы, Наркамаему, Культпропу ЦК КП(б)Б, ЛКСМБ, прадстаўнікі друку, ЦБ пралетэтуду, Белдзяржвыдавецтва, калгасцэнтру, Белсамарамсаюзу, Белкаапсаюзу, дырэктары і загадчыкі навуч. часткі Менскіх пэдтэхнікумаў. Таксама запрашаюцца на гэтую нараду прадстаўнікі фабкомаў заводаў і фабрык г. Менску.
Нарада адбудзецца ў памяшканьні БДУ (прыродазнаўчы корпус).

ВЫШАЎ з ДРУКУ
№ 22 ЖНІВЕНЬ № 22
ЧАСОПІСІ
„Беларуская Работніца і Сялянка"
Зьмест нумару:
1. Работніцы і сялянкі Кітаю—актыўныя змагары за Саветы.
2. Выкананьні рашэньні XVI зьезду УсеКП(б).
3. Абвясьцім сацыялістычнае спаборніцтва на выкананьне пляну хлебазагатовак.
4. А. Г.—Аб разьмеркаваньні ўраджаю ў калгасах.
Матар'ялы з месц.
5. Прыкладным правядзеньнем уборачнай кампаніі пакажам перавагу калгасаў.
6. Пазыкай дапаможам хутчэйшай індустрыялізацыі краіны.
7. Барацьбой з прагуламі дабіемся ўстанаўленьня працоўнай дысцыпліны ў калгасах.
8. Саспаборніцтвам і ўдарніцтвам ліквідуем прарывы ў прамфінпляне.
9. Дабіемся палянтэньня працы з дэлегаткамі.
10. НА ПАБУДОВЕ.—Апавяданьне Бялінь-Падгаецкага.
11. Садавод РАЖКОЎ.—Як убіраць і захоўваць гародніну.
12. Д-р ПОЛЯК.—Чаму ў жанчыны бывае бясплоднасьць.
13. Д-р ПРАТАКЛІТАЎ.—Першая дапамога дзецям у няшчасных выпадках.
14. Што зроблена па допісах рабселькорак.
15. Старонка ручной працы.


Друкарня газ. «Зьвязда», Менск.

Менск. Галоўлітбел 337.